8. **Трусава А.** Гісторыя знішчэння Мікалаеўскага сабора ў Віцебску.// Віцебскі сшытак. № 1, 1995.

9. **Ал. Бутер, Иерей Ф. Кривонос**. Полоцкая Епархия в 20-30-е годы XX столетия. Жировичи, 2001.

10. **ПЗА**. Ф. 51, воп. 1, спр. 28.

11. **ПЗА**. Ф. 51, воп. 1, спр. 108.

12. **ПЗА**. Ф. 51, воп. 1, спр. 91.

13. **ПЗА**. Ф. 51, воп. 1, спр. 129.

14. **Памяць. Віцебск.** Кн.1. Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 2002.

15. **ПЗА.** Ф. 51, воп. 1, спр. 31.

16. **Вахрина В.И.** Спасо-Ярославский Димитриевский монастырь в Ростове Великом. Ростов, 1994.

17. **ДАВВ.** Ф. 1821, воп. 1, спр. 425.

18. **ДАВВ.** Ф. 1821, воп. 1, спр. 133.

19. **ПЗА.** Ф. 51, воп. 1, спр. 90.

20. **Революция и церковь**. № 1-2, 1924.

# Психологический аспект в работе с учащимися спецшколы по музейно-педагогическим программам

*Т.Р. Смирнова*

Свою работу с детской аудиторией мы начинали с исследований эмоциональной сферы в момент восприятия музейного предмета. Определяли эмоциональный фон всех музейно-педагогических занятий. Результаты были положительные: детям нравится ходить в музей, очень ярко помнят всех сказочных героев, присутствующих на занятиях, достаточно хорошо запоминали материал, подаваемый музейным педагогом.

Адаптируя экспериментальную программу для детей 4-х лет (на базе детского сада № 29), мы пришли к выводу, что те дети, которые занимались (экспериментальная группа) по программе, лучше ориентируются в предметном мире, на более высоком уровне сформированы обобщённые понятия, больше слов находится в активном словаре, чем те, которые не участвовали в эксперименте.

Но в этом учебном году проводя и посещая большинство занятий, мы столкнулись с тем фактом, что дети дошкольного возраста, ученики начального и среднего звена школы не дают того показателя произвольности внимания, сосредоточенности и даже интереса по сравнению с предшествующими годами.

В чём причина?

Неопределённость социокультурной ситуации в республике, неблагоприятная экологическая обстановка, появление новых форм эпидемий приводят к возникновению «коллективного страха», устойчивой тревожности, напряжённости как в отношениях между людьми, так и во внутриличностной сфере человека, уничтожают уверенность, разрушают ощущение, что целенаправленной деятельностью можно решить основные проблемы своего бытия.

Усугубляется эта ситуация ещё характером современного образования, зачастую отличающегося формализацией, информатизацией и рационализацией.

Эти явления на детей оказывают двоякое действие: у них возникает чрезмерная комфортность, формируется пассивная позиция приспособленчества и личностное образование, как тревожность.

Эта проблема чрезвычайно актуальна, так как ситуация в обществе меняется настолько стремительно, что даже многие взрослые не успевают адаптироваться к новым условиям.

Уровень детской невротизации увеличился в 5-10 раз (по последним данным из исследований психологов).

15 лет назад насчитывалось (в Белоруссии) 5-7 % младших школьников с невротическими явлениями, во второй половине 90-х годов уже 40-70 %.

Всё это натолкнуло нас на ту мысль, что познавательный интерес – вторичен. А что тогда первично? В чём смысл и значимость музейно-педагогических занятий?

Ответить на этот вопрос помогла нам экспериментальная работа с учащимися спецшколы № 17 г. Полоцка. В нём участвовало 108 детей. Дети с нарушениями в интеллектуальной сфере достаточно открыты в эмоциональном проявлении, своим поведением и реакциями они тут же выражают отношение к происходящему.

Исследуя их психические реакции, можно хорошо проследить силу воздействия, значимость подаваемого материала, на музейно-педагогических занятиях.

Как происходил эксперимент, и к каким выводам мы пришли:

Первый год учащиеся посещали занятия. Подаваемую информацию они запоминали с трудом. Их интересовало место, смена действия, новая обстановка. Внимания их хватало только на 15-20 мин.

Во второй год формировался навык слушания, умения мысленно включаться в рассказ, управлять восприятием. Временные понятия не сформированы и остаются на низком уровне развития.

И только на 3-й год эксперимента у учащихся стал возникать образ предмета, сформировались навыки музейной культуры.

**Вывод:**

**1.** Состояние напряжения вызывает у детей длительное и затяжное присутствие непроизвольного внимания, снижения устойчивости и интереса к информации.

**2.** Музейно-педагогические занятия на данный момент носят психокоррекционный характер. На первое место выступают корригирующие факторы (музыка, театрализация, сенсорика, ритм, заметная и частая смена деятельности и даже положение тела).

**Литература**

**Варенова Т.В.** Теория и практика коррекционной педагогики. Мн.: Асар, 2003.

**Зимняя И.А.** Педагогическая психология. Ростов-на-Дону: Феникс, 1997.

**Коломенский Я.Л., Панько Е.А**. Детская психология. Мн.: Университетская, 1988.

**Столяренко Л.Д.** Основы психологии. Ростов-на-Дону: Феникс, 1997.

**Цыркун Н.А.** Социально-психологические закономерности развития воли у дошкольников. Мн.: Н М центр, 2000.

# Беларускія мастакі – навучэнцы Полацкай езуіцкай калегіі (акадэміі)

***Т.У. Явіч***

На Беларусі першыя элементы сучаснай арганізацыі навучання жывапісу з'явіліся ў каталіцкіх установах – калегіумах. У лепшай з іх, Полацкай езуіцкай калегіі, на працягу XVII – першай паловы XVIII стст адбывалася складванне мясцовай мастацкай школы з еўрапейскімі традыцыямі, адчувальнымі яшчэ ў сярэдзіне XIX ст.

З першых крокаў у сваёй педагагічнай дзейнасці на Беларусі езуіты вялікую ўвагу надавалі выкладанню рамяства. Увогуле, вялікая колькасць мастакоў атрымала спецыяльную адукацыю дзякуючы Ордэну. Для беларускіх зямель гэта каля 20 % мастакоў. А сярод іх жывапісцаў, разьбяроў Ордэн даваў каля 100 %.

Але у той сітуацыі яшчэ нельга гаварыць аб планавым мастацкім навучанні. Пры кожнай калегіі існавалі майстэрні, дзе вучні пазнавалі азы майстэрства пад кіраўніцтвам умелых мастакоў, і дзе мастацкія здольнасці і ўменні фарміраваліся перш за ўсё з пункту гледжання неабходнасці царкоўна-каталіцкай практыкі. У Полацкай езуіцкай калегіі ў такіх майстэрнях вучылі жывапісу і сталярству, рыхтавалі мастакоў і разьбяроў.

У XVII – першай палове XVIII стст. тут працавалі такія мастакі, як Адам Адулевіч (каля 1602-1637), Якуб Брэтзер (1690-1733), Матэвуш Бейтнік (1708-1749). Сярод мастакоў, якія атрымалі мастацкую адукацыю ў Полацкай езуіцкай калегіі ў гэты час можна з дакладнасцю назваць Клауса Яна Тадэвуша (1678-1737), палачаніна, езуіта з 1702 года які выкладаў у розных калегіях тэалогію. З 1716 г. ён рэгент канвікта ў Слуцку, дзе і праявіў сябе як мастак, дэкаратар спектакляў і архітэктар.

Другое імя – Ян Клімоўскі (1698-1749). Нарадзіўся ў сям'і прыгонных, якія належалі Полацкай езуіцкай калегіі. Навучаўся ў Полацкай калегіі, у тым ліку і разьбярству. У далейшым працаваў у Вільна як разьбяр над аздабленнем касцёла Св. Яна і касцёла Св. Рафала.

Росквіт полацкай мастацкай школы прыпадае на другую палову XVIII ст. Вядома, што ў гэты час тут працавалі мастакі Ігнацій Дораці (1703-1768) (яму А. Хадыка прыпісвае аўтарства вядомых полацкіх партрэтаў: Квіена з Націянальнага мастацкага музея РБ і Прозэра з Націянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі), Габрыэль Грубер (1740-1805); Малахоўскі (?-1806), Каэтан Анжыаліні (1748-1816). У 1788 г. тут адчыніў свае дзверы музей, у склад якога ўвайшла карцінная галерэя. У музейным корпусе была абсталявана зала для заняткаў малюнкам, жывапісам і архітэктурай, забяспечаная разнастайнымі мадэлямі, кнігамі, малюнкамі і гравюрамі. Сістэма выкладання была далёкай ад акадэмічнай і будавалася пераважна на капіраванні з гравюр і з жывапісных твораў П. Рубенса, С.Розы, Ш. Чаховіча, Юз. Пешкі. Малявалі навучэнцы і з гіпсавых мадэляў. Некаторыя даследчыкі выказваюць меркаванне (Ст. Заленскі), што ў калегіі выкладаўся курс тэорыі жывапісу. Практыкаваліся тут і штогадовыя справаздачныя выставы вучняў. Сярод іх з'явіліся майстры, чые творы разам з творамі выкладчыкаў і прыезджых мастакоў траплялі ў музей. Перш за ўсё, гэта Аўгусцін Нядзвецкі. У Полацку ён знаходзіўся з 1784 па 1800 гг. Згодна з Гіжыцкім, у 1796 г. А. Нядзвецкі вучыўся ў 5 класе.Быў вучнем Г. Грубера. Рабіў копіі з Рубенса, Тыцыяна, Рафаэля, якія пазней ўпрыгожвалі залы Полацкай карціннай галерэі. Вядома, што пасля ад'езду з Полацка ў Польшчу А. Нядзвецкі маляваў карціны на антычныя сюжэты і працаваў у бытавым жанры.

Прыкладна ў той жа час у Полацкай калегіі вучыўся Каспар Бароўскі (1785, Гродзеншчына – 1854). Каспар Бароўскі быў адным з першых, хто пасля заканчэння Полацкай езуіцкай калегіі працягваў у 1801-1807 гг. мастацкую адукацыю ў Віленскім універсітэце на факультэце выяўленчага мастацтва. Там яго настаўнікам быў Ф. Смуглевіч. У 1811-1812 гг. К. Бароўскі працаваў настаўнікам малявання ў Мінскай гімназіі (створанай на базе былой езуіцкай калегіі). З 1813 г. жыў і працаваў ў Беластоку. Бароўскі вядомы як майстар бытавой кампазіцыі,пісаў карціны на сюжэты з антычнай гісторыі і рабіў бытавыя замалёўкі ў стылі Ф. Смуглевіча («Гарадская харчэўня», «Цыгане» з Нацыянальнага музея Варшавы). У 1835

г. К.Бароўскі напісаў абразы для касцёла ў в. Вялікія Эйсманты (Свіслацкі раён).

Твораў як А. Нядзвецкага, так і К. Бароўскага ў музеях Беларусі не захавалася. Творчасць гэтых майстроў яшчэ патрабуе глыбокага даследавання і вывучэння.

Адным з самых вядомых беларускіх мастакоў першай паловы XIX ст. быў Валенцій Ваньковіч. Нарадзіўся будучы мастак 12 мая 1800 г. у маёнтку Калюжыцы Ігуменскага павета Мінскай губерніі (цяпер Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці) у сям'і павятовага суддзі Мельхіёра Ваньковіча. Вядома, што ў 1811 г. Валенцій паступіў вучыцца ў Полацкую езуіцкую калегію.Творчыя здольнасці 11-гадовага хлопчыка заўважылі французы Якуб Перлінг і Якуб Журдэн,якія выкладалі тут малюнак. З 1813 да 1817 г. будучы мастак вучыўся на факультэце філасофіі і вольных мастацтваў. У акадэміі былі яшчэ моцнымі традыцыі, закладзеныя Г. Груберам. Вялікае ўражанне на маладога Ваньковіча зрабілі творы польскіх мастакоў Ш. Чаховіча і Ю. Пешкі, што былі размешчаны ў малявальных класах. На момант заканчэння акадэміі В. Ваньковіч ужо свабодна валодаў тэхнікай жывапісу, пісаў невялікія партрэты- мініяцюры, якія вылучаліся добрым малюнкам і падабенствам.

Пасля заканчэння Полацкай Акадэміі В. Ваньковіч паступіў у Віленскі універсітэт (у 1818) на факультэт літаратуры і выяўленчых мастацтва. Яго настаўнікамі былі Ян Дамель і Ян Рустэм.

Ужо ў першыя гады навучання ў Вільні В.Ваньковіч стаў адным з лепшых выхаванцаў факультэта. Ён удзельнічаў у конкурсе кампазіцыі на тэму старажытна-грэцкай міфалогіі. За работу «Філантэт на востраве Лемнас» яму прысудзілі першую прэмію.

Паводле рашэння вучонай рады Віленскага універсітэта ў 1824 г. малады творца быў накіраваны ў Пецярбургскую Акадэмію мастацтваў «дзеля ўдасканалення ў жывапісным мастацтве» (1825-1828 гг.). Там В. Ваньковіч пад кіраўніцтвам вядомых майстроў рускага класіцызму Васіля Шабуева і Аляксея Ягорава дасягнуў значных поспехаў. За малюнкі з натуры малады мастак атрымаў Другі (1825) і Першы (1826) сярэбра-

ныя медалі. Залатым медалём ён быў ўзнагароджаны за работу «Подзвіг маладога кіяўляніна» (1827). Усё гэта сведчыць пра высокую мастацкую падрыхтоўку В. Ваньковіча .

Трэба адзначыць, што гады, пражытыя ў Пецярбургу, былі для жывапісца самымі насычанымі цікавымі сустрэчамі, творчымі ўражаннямі ды натхнёнай працай. Тут ён напісаў партрэты Аляксандра Пушкіна, Адама Міцкевіча, Марыі Шыманоўскай – вядомай польскай піяністкі. Усе гэтыя партрэты пазначаны 1828 годам, і аб'ядноўвае іх пільная ўвага мастака да выяўлення ўнутранага жыцця чалавека-творцы.

Карціна В. Ваньковіча «Адам Міцкевіч на скале Аюдаг» прызнана шэдэўрам. У ёй мастак змог аб'яднаць узвышанае ўяўленне пра паэта з дакладнай характарыстыкай дарагога сучасніку чалавека. Партрэт атрымаў усеагульнае прызнанне. Ён лічыцца лепшым творам В. Ваньковіча. Захоўваецца ў Нацыянальным музеі Варшавы.

З 1829 года Валецій Ваньковіч жыў у Мінску і меў майстэрню ў Сляпянцы (прыгарадзе). У гэты час мастак стварыў шэраг партрэтаў: сястры (С. Горнаўскай), А. Манюшкі, бацькі, жонкі з дзецьмі, А. Гарэцкага, К. і А. Тавянскіх, С. і К. Пясецкіх, В. Пуслоўскага і членаў ягонай сям'і ды іншыя. У гэтых партрэтах шмат супярэчлівага. Часам яны былі поўныя натхнення, парыву, часам жа насілі адбітак сентыменталізму. Творчую працу партрэтыст спалучаў з настаўніцкай.

Ён даваў урокі мастакам-пачаткоўцам Банавентуры Клямбоўскаму і Тадэвушу Гарэцкаму.

На прыканцы 1830-х гадоў В. Ваньковіч пакінуў Мінск і вандраваў па Еўропе. Нейкі час жыў і працаваў у Дрэздэне, Берліне, Мюнхене, Страсбургу. Вандруючы па гарадах Еўропы, В. Ваньковіч шмат маляваў, капіраваў творы класікаў, стварыў шэраг жывапісных твораў. Пасля прыезду ў 1841 г. у Парыж мастак пасяліўся ў доме свайго даўняга сябра А. Міцкевіча. Тут ён напісаў свае апошнія творы: манументальныя палотны «Апафеоз Напалеона», «Напалеон плача над картай Еўропы», абразы «Евангеліст Іаан», «Святая Клара». Самы апошні твор, напісаны майстрам, – «Маці Божая Вастрабрамская» – знаходзіцца ў парыжскай царкве Сэн-Севярын.

12 мая 1842 г. на руках у Адама Міцкевіча мастак памёр ад сухотаў (па іншай версіі ад хваробы сэрца). Пахаваны В. Ваньковіч на Манмарцкіх могілках дэ Сэн-Дэні ў Парыжы.

Творы В. Ваньковіча захоўваюцца ў музеях Санкт-Пецярбурга, Вільнюса, Варшавы, Парыжа, Лондана. Шмат іх у прыватнай калекцыі нашчадка Валенція Ваньковіча, вядомага польскага пісьменніка Мельхіёра Ваньковіча. Нягледзячы на тое, што на Беларусі не захавалася твораў мастака, яго творчасць тут добра вывучана. Аб гэтым сведчыць і адкрыццё ў Мінску на прыканцы XX ст. музея – «Дом Ваньковічаў. Культура і мастацтва першай паловы XIX стагоддзя». Спецыяльна для гэтага музея зроблены тры копіі твораў В. Ваньковіча – партрет А. Міцкевіча і дзве гравюры, выкананыя вядомым беларускім мастаком А. Кашкурэвічам.

Яшчэ адзін вядомы мастак – выхаванец полацкай езуіцкай калегіі – Рафал Слізень (1804-1881). Нарадзіўся ён у сям'і памешчыка Яна Слізеня ў маёнтку Бортнікі Навагрудскага павета Мінскай губерніі. Пачатковую адукацыю атрымаў у школе базыльян у мястэчку Вольна. Пасля, разам з малодшым братам Отто, працягваў абучэнне ў канвікце пры Полацкай езуіцкай калегіі, дзе і захапіўся выяўленчым мастацтвам: праграма канвікта ўключала заняткі малюнкам ужо з першага класа. У гэтыя гады ён напісаў свае першыя партрэты, зрабіў замалёўкі розных краявідаў. Захаваліся звесткі аб тым, што Рафал Слізень добра вучыўся. У 1817 годзе па заканчэнні другога класа ён заслужыў «пахвалу». Прыкладна ў гэты ж час ён меў намер уступіць у ордэн езуітаў, але не атрымаў на гэта згоды бацькоў.

Пасля закрыцця Полацкай езуіцкай акадэміі ў 1820 г. Р.Слізень паступіў на факультэт права Віленскага універсітэта. Адначасова наведваў жывапісны клас, якім кіраваў Ян Рустэм, і скульптурны клас, які узначальваў Казімір Ельскі. Дзякуючы вучобе ў гэтых двух класах Слізень не толькі набываў прафесійныя веды і навыкі, але засвоіў асветніцкую філасофію і эстэтыку класіцызму, якія сцвярджалі патрыятычныя, грамадзянскія ідэалы, значнасць чалавечай асобы. Таму зусім не выпадкова, што ў час вучобы ва універсітэце ў 1823-1824гг. Рафал зблізіўся з таварыствам філарэтаў, у склад

якога ўваходзілі Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Ігнат Дамейка, Томаш Зан і інш.

Пасля заканчэння універсітэта Рафал Слізень некаторы час, а менавіта з 1826 г. да 1829 г., працаваў у Пецярбургу ў Міністэрстве ўнутранніх спраў, адначасова працягваў займацца скульптурай. У 1830 г. ён пасяліўся ў сваім маёнтку, дзе і правёў амаль усё жыццё. Менавіта там Р. Слізень стварыў некалькі дзесяткаў жывапісных і скульптурных выяў сваіх родных, блізкіх, знаёмых, суседзяў. Шмат увагі аддаў і дробнай пластыцы, пераважна медальернаму мастацтву. Вядомы 47 медалёў (па іншай версіі 57), выкананых Р. Слізенем у розныя гады. Сярод іх – медаль Яна і Анеліі Слізеней, прысвечаны іх залатому вяселлю, а таксама медалі Уладзіслава, Люцыяна, Браніслава Слізеней. Стварыў ён барэльефы і медалі грамадскіх дзеячоў, перадавых прадстаўнікоў культуры – Томаша Зана, Эдварда Адынца, Адама Міцкевіча, Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў, Адама Хрыптовіча, Генрыха Ржавускага і інш. Па мастацкіх якасцях гэта былі дасканалыя творы, у іх адчувалася ўпэўненая рука і тонкі мастацкі густ, смелае выкарыстанне традыцый класіцызму і рамантызму.

Вядома, што нейкі час у маёнтку Р. Слізеня жыў Ян Чачот. Тады, верагодна, і быў выканан медаль з яго выявай. Ёсць звесткі, што нейкая мініяцюрная выява Чачота з прыватнай калекцыі экспанавалася ў 1912 г. на выставе мініяцюр у Варшаве. Магчыма, размова ідзе пра медаль работы Р. Слізеня. Шмат жывапісных і скульптурных работ Р. Слізеня захоўваліся ў свой час у прыватных калекцыях, як, напрыклад, у Лагойскім палацы Тышкевічаў, у Бешанковіцкім палацы Храптовічаў.

Некаторы час Р. Слізень займаўся педагагічнай дзейнасцю: у яго вучыўся скульптуры Ян Астроўскі.

Слізень быў вядомы не толькі як жывапісец і скульптар, але і як архітэктар. Ён стаў аўтарам праектаў некалькіх палацаў і гаспадарчых пабудоў, адна з якіх захавалася да нашага часу.

У сучасных беларускіх музеях няма ніводнай работы Рафала Слізеня- няўмольны лёс раскідаў іх па музеях Польшчы, Літвы, а магчыма і іншых краін. Вялікая калекцыя яго работ,

твораў вядомых мастакоў і цікавы збор вырабаў з фарфору – усё ў асноўным сабранае дзякуючы намаганням Р.Слізеня, перад 1939 г. былі вывезены з Беларусі ў Варшаву апошнім гаспадаром маёнтка Вольна Генрыкам Слізенем.

Такім чынам, у XVII – першай чвэрці XIX стст. Полацкая езуіцкая калегія адыграла значную ролю ў станаўленні мясцовай мастацкай школы, у выхаванні будучых знакамітых мастакоў, у фарміраванні на гэтай зямлі своеасаблівага мастацкага асяроддзя.

**Літаратура**

**Гісторыя беларускага мастацтва** : У 6 т. Т. 3: Канец XVII – пач. XX ст. Мн., 1989.

**Дробаў Л.** Беларускія мастакі XIX стагоддзя. Мн., 1971.

**Дробов Л.** Белорусская жывопись 19 – начала 20 вв. Мн., 1974.

**Кісялёў Г.В.** Ад Чачота да Багушэвіча: Праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст. Мн., 2003.

**Мальдзіс А.** І ажываюць спадчыны старонкі: Выбранае/ Прадм. Г.В. Кісялёва. Мн., 1994.

**Памяць**: Гіст.-докум. Хроніка г. Баранавічы і Баранавіцкага р-на. Мн., 2000.

**Паньшчына І.** Ісьціна вымалёўваецца: Валенцій Ваньковіч. Новыя факты біяграфіі.// Мастацтва, 1994, №1.

**Materyaiy do dziejyw akademii Poiockiej i szkyi od niej zaleïnych**. Krakyw, 1905.

**Poplatek J., Paszenda J.** Słownik jezuitów artystów. Kraków, 1972.

# Агляд калекцый, каталогі прадметаў з фондаў НПГКМЗ

# Газеты ў фондах НПГКМЗ

*І.П. Воднева*

Калекцыя газет, якія захоўваюцца ў фондах НПГКМЗ, пачала камплектавацца з 1957 г. Большасць з іх – гэта выданні, якія друкаваліся на тэрыторыі Беларусі. Але ёсць і газеты, выдадзеныя ў Расіі, Латвіі, Польшчы, ЗША і іншых краінах свету. Значная частка газет паступіла з асабістых збораў: Маніса М.А., Матусевіча А.Л. (перададзеныя яго дачкою Чачуга А.А.), Дэйніса І.П. (перададзеныя яго сваячкаю Бараўковай А.В.). Калекцыя газет папаўняецца дзякуючы і прыватным асобам г. Полацка – Баўтовічу М.М., Леры Сом, Арлову П.А. На канец 2003 г. калекцыя налічвала 1096 адзінак асноўнага фонду і 13 – навукова-дапаможнага. Большасць газет захоўваецца ў фондасховішчы НПГКМЗ. Невялікая частка прадстаўлена ў экспазіцыі музеяў:

- Музей беларускага кнігадрукавання – 31 адзінка,
- Полацкі краязнаўчы музей – 8 адзінак,
- Музей баявой славы – 2 адзінкі,
- Стацыянарная выстава «Прагулка па вуліцы Ніжнепакроўская. пач. XX ст.» – 1 адзінка, дзе ўсяго 14 нумароў.

Зараз па колькасці значна пераважае наша полацкае выданне «Полацкі веснік», якое ў розныя часы мела розныя назвы: «Чырвоная Полаччына» – 2 адз., «Бальшавіцкі шлях» – 154 адз., «Большавіцкі сцяг» – 25 адз., «Сцяг камунізма» – 173 адз., «Полацкі веснік» – 17 адз. (усяго 371 адз.). Асобныя газеты здадзены ў фонды падшыўкамі. Яны налічваюць дастатковую колькасць нумароў: «Беларус» – падшыўка за 1993 г., дзе 94 нумары, «Зорка» – падшыўка за 1969-1977 гг., дзе ўсяго 208 нумароў і інш. Калекцыя газет пастаянна папаўняецца.

Складанне каталогаў газет – гэта мэтанакіраваная праца па сістэматызацыі і аналізу дадзенай калекцыі. У аснову структурнай пабудовы каталогаў пакладзены храналагічны прынцып. Мэтазгодна вылучыць наступныя храналагічныя перыяды:

**1.** Газеты к. XIX – пач. XX стст., надрукаваныя на тэрыторыі Беларусі.

**2.** Газеты 1918-1940 гг., надрукаваныя на тэрыторыі Беларусі.

**3.** Газеты 1941-1945 гг., надрукаваныя на тэрыторыі Беларусі.

**4.** Газеты 1946-1979 гг., надрукаваныя на тэрыторыі Беларусі.

**5.** Газеты 1980-1985 гг., надрукаваныя на тэрыторыі Беларусі.

**6.** Газеты 1986-1989 гг., надрукаваныя на тэрыторыі Беларусі.

**7.** Газеты 1990-1994 гг., надрукаваныя на тэрыторыі Беларусі.

**8.** Газеты 1995-1999 гг., надрукаваныя на тэрыторыі Беларусі.

**9.** Газеты 2000 – пач. XXI ст., надрукаваныя на тэрыторыі Беларусі.

Асобна варта вылучыць газеты, выдадзеныя ў іншых краінах, колькасць якіх дастаткова значная. Кожны храналагічны перыяд плануецца выдаць асобным каталогам, які будзе уключаць уступны артыкул з кароткім апісаннем дадзенага гістарычнага перыяду, спіс газет у алфавітным парадку, тэксты каталожных артыкулаў тых выданняў, якія адносяцца да дадзенага каталога, спіс выкарыстанай літаратуры. Некаторыя газеты факсімільна ўзнаўляліся. Таму асобныя каталогі будуць утрымліваць дадаткі, уключаючыя такія факсімільныя выданні.

План тэксту каталожнага артыкула.

**1.** Назва выдання.
**2.** Заснавальнік.
**3.** Час і месца выдання.
**4.** Мова выдання.
**5.** Перыядычнасць.
**6.** Выдавец.
**7.** Рэдактар.
**8.** Змест асноўных публікацый.

Парадак апісання прадмета каталога.

**1.** Парадкавы нумар.
**2.** Поўная назва.
**3.** Нумар і час выдання.
**4.** Выдаўцы.
**5.** Месца выдання.
**6.** Цікавыя артыкулы і паведамленні.
**7.** Нумар па КП.

Вывучэнне калекцыі газет і яе сістэматызацыя мае важнае значэнне. Дзякуючы гэтаму набываецца інфармацыя аб тым, якія газеты ёсць у фондах НПГКМЗ і аб тым, якія матэрыялы яны ўтрымліваюць. Ужо сёння матэрыялы перыядычных выданняў служаць крыніцамі для навуковых прац, шырока выкарыстоўваюцца на выставах, якія праходзяць у музеях НПГКМЗ, на занятках па праграме «З кнігай праз стагоддзі і краіны».

## КАТАЛОГ. Частка І.

## Газеты XIX – пач. XX стст., надрукаваныя на тэрыторыі Беларусі.

Першыя газеты на тэрыторыі Беларусі з’явіліся на мяжы XVIII-XIX стст. Але іх папярэднікамі былі аднадзёнкі, якія ўпершыню былі надрукаваны ў XVI ст. Так у пач. 1563 г. у Нясвіжскай друкарні выйшлі «**Новіны грозные а жалостлівые…**», у якіх асвятляліся паддзеі, звязаныя з захопам Полацка войскам Івана Жахлівага. Першай газетай ВКЛ была «**Газэта літэрацка Віленьска**», якая выдавалася ў 1760-1916 гг. у Вільні на польскай, потым на польскай і рускай, а з 1865 г. на рускай мове. На тэрыторыі ж сучаснай Беларусі першым перыядычным выданнем стала «**Газэта Гродзеньска**», якая друкавалася з 1776 па 1783 гг. у Гродне на польскай мове штотыднёва.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і далучэння часткі Беларусі да Расійскай імперыі ў кожным губернскім цэнтры былі заснаваны друкаваныя органы губернскіх праўленняў – афіцыйныя выданні на рускай мове. З 1838 г. такія газеты выдаваліся ў Вільні, Віцебску, Гродне, Мінску і Магілёве. У другой палове XIX ст. царкоўная губернская адміністрацыя таксама пачала друкаваць сваё выданне. «Епархиальные ведомости» выходзілі ў Мінску, Магілёве, Гродне і Віцебску («**Полоцкие епархиальные ведомости**», 1874-1916).

Першым нацыянальным перыядычным органам стала газета «**Мужыцкая праўда**», якую выдавалі нелегальна ў 1862-1863 гг. К. Каліноўскі і яго паплечнікі. А першай легальнай газетай на Беларусі быў «**Минский листок**», які выходзіў ў 1886-1902 гг. Газета змяшчала матэрыялы па гісторыі,

этнаграфіі, эканоміцы Беларусі. Такім чынам, канцы XIX ст. перыядычны друк на Беларусі атрымаў пэўнае развіццё. Так у 1898г. у 5 заходніх губернях Расіі выдавалася толькі 14 газет,у тым ліку 3 прыватныя.

У пачатку XX ст. стан друку на Беларусі палепшыўся. Нарэшце пачыў развівацца правінцыяльны перыядычны друк. Не толькі ў Мінску і Вільні, але і ў іншых беларускіх гарадах апрача губернскіх і епархіальных ведамасцей, пачалі выдавацца грамацка-палітычныя і літаратурныя газеты. Так на тэрыторыі Віцебскай губерні выходзілі «**Витебский вестник**», «**Витебская жизнь**», «**Полоцкий листок**», «**Полочанин**» і іншыя.

Рэвалюцыя 1905-1907 гг. спрыяла разгортванню грамадскага руху на Беларусі, у значнай ступені зняла абмежаванні з друкаванага слова. Пасля адмены ў 1905 г. забароны на беларускамоўныя публікацыі з'явіліся нацыянальныя перыядычныя выданні. Цэнтрам нацыянальнага адраджэння і літаратурнага жыцця Беларусі стала газета «**Наша Ніва**», якая выдавалася ў Вільні у 1906-1915 гг.

У Першую сусветную вайну і пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. на Беларусі выдавалася больш за 80 газет, у тым ліку савецкія, сялянскія, газеты партый і рухаў на беларускай, рускай, польскай, яўрэйскай мовах. Газета стала сродкам барацьбы розных партый за пашырэнне сваіх правоў. Такім чынам, нягледзячы на ўсе забароны і перашкоды, газеты на Беларусі ў к. XIX – пач. XX стст. друкаваліся. Гэта склала аснову для развіцця беларускага друку ў больш позні час.

У фондах НПГКМЗ на канец 2003 г. налічвалася 35 адзінак асноўнага фонду, якія адносяцца да дадзенага перыяду. Частка газет экспануецца ў музеях НПГКМЗ: МБК – 8 адзінак, ПКМ – 2 адзінкі. Большасць выданняў, якія ўвайшлі ў дадзены каталог, рускамоўныя – 33 адз. (158 нумароў). Беларускамоўных толькі 2 адз. (34 нумары). Гэта абумоўлена асаблівасцямі гістарычнага развіцця беларускіх земляў таго парыяду.

**1.** «**Витебский Вестник**» № 57, 12.03.1917 г. Выданне рэдакцыі газеты. Друкарня Віцебскай губерні. г. Віцебск. 1917г.
**ПИАЗ КП5-2440**

Штодзённая грамадска-палітычная газета расійска-шавіністычнага, вялікадзяржаўнага кірунку. Выдавалася з 1(14).7.1912 г. да 16(29).4.1917 г. у Віцебску на рускай мове. Выдаўцы Ляхвіцкі А.А., Велікотны А.М., Медзякоў У.І. Аб'ядноўвала вакол сябе мясцовых актывістаў Саюза рускага народа і правых акцябрыстаў. Выдавалася на ўрадавыя сродкі. Друкавала перадавіцы афіцыёзнага зместу, афіцыйна-ўрадавыя матэрыялы, хроніку, агляды рускіх газет і часопісаў, аб'явы; мела рубрыкі «Па Расіі», «З жыцця губерні», «Земскае і прыходскае жыццё», «Тэатр і музыка», «Замежныя весткі», «Бібліяграфічны аддзел».Сваёю мэтаю ставіла барацьбу за «святую справу ўкаранення ў сыноў і дачок Беларускага краю рускай праваслаўнай свядомасці» (1.07.1912 г.), службу «самадзяржаўнаму цару і праваслаўнай веры».

Публікавала этнаграфічныя даследаванні Е.Раманава, апавяданні і нарысы А. Пшчолкі, творы мясцовых аўтараў, змясціла гісторыка-краязнаўчы нарыс А. Сапунова «Французы ў Віцебску». Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 г., перайшла на памяркоўна-ліберальную пазіцыю, крытыкавала негатыўныя бакі «дарэвалюцыйнага ладу», адзначала ролю тэатра ў псіхалагічнай падрыхтоўцы рэвалюцыі.

**2. «Витебские губернские ведомости»** № 57, 11(24).03.1901 г. Рэдактар І. Пілін. Друкарня Віцебскай губерні. г. Віцебск, 1901 г.

«Воззваніе о пожертвованіи на построеніе нового Покровского в городе Полоцкаго храма вместо сгоревшего храма 21.05.1900 г.», с. 1.

**ПИАЗ КП5-2733**

Газета, афіцыйны орган Віцебскага губернскага праўлення. Выдавалася з 1838 года да 23.12.1917 г. (5.01.1918 г.) у Віцебску на рускай мове з рознай перыядычнасцю. Мела афіцыйны і неафіцыйны (1845 г.) аддзелы. Афіцыйны змяшчаў пастановы і распараджэнні цэнтральнай і мясцовай улады. Неафіцыйны меў значэнне самастойнай газеты, з 1901 г. выдаваўся асобна, асвятляў падзеі ў краіне і за мяжой, жыццё Віцебска, Полацка, Веліжа і іншых населеных пунктаў губерніі, друкаваў літаратурныя творы, даследаванні

па гісторыі, краязнаўству, этнаграфіі, фальклору, змяшчаў артыкулы гаспадарчай тэматыкі.

Як дадаткі да газеты выходзілі «Телеграммы «Витебских губернских ведомостей» (1887-1892, 1895-1905) і «Народный листок» (1907).

29.06.1912 г. выданне неафіцыйнага аддзела спынена, замест яго выходзіць газета «Витебский вестник».

3. «**Витебские губернские ведомости**» № 118, 31.05.(13.06.)1903 г. Рэдактар І. Пілін. Друкарня Віцебскай губерні. г. Віцебск, 1903 г.

Рэкламныя звесткі пра кнігу А.Р. Пшчолкі “Очерки и разсказы изъ белорусской жизни», г. Полоцк, магазин Гофеншефера, с. 1.

«Письмо въ редакцію» (ад І. Ямельянава, святара згарэўшай Пакроўскай царквы ў Полацку), с. 3.

**ПИАЗ КП5-2734**

4. «**Витебские губернские ведомости**» № 148, 5(18).07.1903 г. Рэдактар І. Пілін. Друкарня Віцебскай губерні. г. Віцебск, 1903 г.

Звесткі пра агульны сход членаў Віцебскага пажарнага таварыства, с. 2.

Звесткі пра лівень з градам 27 чэрвеня за 18 вёрст ад Полацка, с. 3.

«Кореспонденція. Полоцкіе письма» (зветкі пра гастролі ў Полацку маларас. трупы пад кіраўніцтвам Зарніцкага і пра рачную ваду, якую п’юць палачане замест артэзіянскай), с. 3.

«О полотскомъ Покровскомъ приходе» Алексіьй Морель, с. 2.

**ПИАЗ КП5-2735**

5. «**Витебские губернские ведомости**» № 159, 18(31).07.1903 г. Рэдактар І. Пілін. Друкарня Віцебскай губерні. г. Віцебск, 1903 г.

Звесткі з «Полоцк. епарх. ведом.», с. 2.

«Ещё къ вопросу о Покровскомъ приходе. Письмо въ редакцію» (от Дм.Ив. Довгяло), с. 2-3.

**ПИАЗ КП5-2736**

**6.** «**Витебские губернские ведомости**» № 171, 2(15).08.1903 г.

Рэдактар І. Пілін. Друкарня Віцебскай губерні. г. Віцебск, 1903г.

Фельетонъ «Всё ещё о Полотскомъ Покровскомъ приходе», с.3.

**ПИАЗ КП5-2737**

**7.** «**Витебские губернские ведомости**» № 172, 3(16).08.1903 г. Рэдактар І. Пілін. Друкарня Віцебскай губерні. г. Віцебск, 1903 г.

Рэкламныя звесткі пра кнігу А.Р. Пшчолкі «Очерки и разсказы изъ белорусской жизни. Вып. 2-й. г. Полоцк, книжный магазин Гофеншефера», с. 4.

**ПИАЗ КП5-2738**

**8.** «**Двинский листок**» № 246, 4.09.1902 г. Рэдактар-выдавец Якубовіч С.Я. Друкарня Якубовіча С.Я. г. Дзвінск, 1902г.

**ПИАЗ КП5-2732**

Грамадска-літаратурная газета. Выдавалася з1900 г. у г. Дзвінску Віцебскай губерні на рускай мове. Выдавец – Якубовіч С.Е., рэдактар выдання. Друкавалася ў друкарні Якубовіча. Мела рубрыкі «Аб'явы», «Дзвінскі дзённік», «Гарадскія нататкі», «Унутраныя навіны», «Тэлеграмы», «Даведачны аддзел». Друкавала невялікія артыкулы, фельетоны на бытавыя тэмы.

**9.** «**Литовскія Епархіальныя Ведомости**» №№ 1-24, 1870 г. (год восьмой). Падшыўка. Рэдактар І. Катовіч. Друкарня Блюмовіча А.С. г. Вільня, 1870 г.

«Диаконъ Иванъ Фёдоровъ, первопечатник московский въ Западной Россіи» Иоаннъ Котовичъ (пра Заблудаўскае Евангелле), № 3, с. 100.

«Известіе касательно мощей Іосафата Кунцевича», № 7, с. 260.

«Объявленіе об изданіе месяцеслова на всякій год» в г.Полоцке Арсеніемъ Скворцовым», № 20, с. 858.

«Перенесеніе мощей преподобной Ефросиніи, княжны полоцкой (перепечатано из сообщения в «Витеб. губер. ведомостях»), № 25, с. 1054.

**ПГКЗ КП14-11340**

Штотыднёвае (да 1873 г., потым – двухтыднёвае) выданне, орган Літоўскай праваслаўнай духоўнай кансісторыі. Выдавалася ў 1863-1917 гг. у Вільні на рускай мове. У 1870-1902гг. яго рэдактарам быў протаіерэй І. Катовіч (да таго часу і пасля рэдактарамі былі рэктары або інспектары Літоўскай духоўнай семінарыі). Выданне прызначалася для Літоўскай праваслаўнай епархіі, мела афіцыйны і неафіцыйны аддзелы. У афіцыйным аддзеле друкаваліся пастановы і распараджэнні ўрада і мясцовых улад па царкоўных справах, рашэнні і справаздачы Сінода, аб'явы і распараджэнні Літоўскай духоўнай кансісторыі. У неафіцыйнай частцы друкаваліся матэрыялы па гісторыі праваслаўнай царквы ў Беларусі, гісторыі асобных храмаў і манастыроў, біяграфічныя нарысы пра царкоўных дзеячаў і інш. З 1907 г. неафіцыйную частку замяніў «Вестник Виленского православного Св.-Духовного братства».

**10.** «**Литовскія Епархіальныя Ведомости**» №№ 2-39, №№ 41-52, 1875 г. (год четырнадцатый). Падшыўка. Рэдактар І. Катовіч. Друкарня Віцебскага Губернскага праўлення. г.Вільня, 1875 г.

«Доклад Полоцкому преосвещенству членов Полоцкого епархіального попечительства», № 5, с. 39.

**НПГКМЗ КП18-20686**

**11.** «**Литовскія Епархіальныя Ведомости**» №№ 1-52, 1885 г. (год двадцать четвёртый). Падшыўка. Рэдактар І. Катовіч. Друкарня Губернскага праўлення. г. Вільня, 1886 г.

Пігулеўскі Л. «Слово во празднованіе 18-й годовщины Братства во имя свят. Николая и препод. княжны Евфросиніи въ Полоцкъ (26 мая 1885 г.)», № 30, с. 303-304.

**ПГКЗ КП14-11338**

**12.** «**Наша Ніва**» №№ 1-5, №№ 7-16, №№ 19-36, 1907 г. Падшыўка. Рэдактар Уласаў А. Друкарня Кухты М. г. Вільня, 1907 г.

Выданні «Нашай нівы» («Беларускі лімэнтар», «Першае чытанне» і інш), № 9, с. 8.

«З Беларусі і Літвы». «Полоцк». (звесткі з настаўніцкай семінарыі пра быт навучэнцаў), № 15, с. 8.

«З Беларусі і Літвы». «Витэбск. Полоцк.».(звесткі пра бастуючых прыказчыкаў вялікіх гарадскіх крамаў у Віцебску і пра дабаўленне новых навук навучэнцам 4-ага класа настаўніцкай семінарыі), № 24, с. 6.

«Па выбарах» (звесткі па Віцебску і Віцебскай губерні), № 4, с. 5; № 10, с. 6-7; № 32, с. 4.

«З Беларусі і Літвы» (артыкул пра навучанне дзяцей у Віцебску», № 29, с.4-7.

«З Белырусі і Літвы» (звесткі пра закрыццё прафесійных саюзаў), № 35, с. 7.

М. Багдановіч. «Музыка». (першая публткацыя), № 24, с. 4.

«Да Беларусоу» (пра выдавецтва «Загляне сонца у наша аконца»), № 34, с. 6.

«З Беларусі і Літвы» (паведамленне пра мужыкоў, якія разам са сваімі семьямі выязджаюць на заробкі на Амур), № 18, с. 7-8.

**ПИАЗ КП8-4343/101**

Штотыднёвае беларускае грамадска-палітычнае, навукова-асветніцкае і літаратурна-мастацкае выданне нацыянальна-адраджэнскага кірунку. Першая беларуская газета з малюнкамі. Выдавалася з 10(23).11.1906 г. да 7(20).08.1915 г. у Вільні на беларускай мове кірыліцай, да 18(31).10.1912 г. яшчэ і лацінкай. Заснавана лідэрамі Беларускай сацыялістычнай грамады братамі І. і А. Луцкевічамі, В. Іванкоўкім, А. Пашкевічам і інш. Рэдактары і выдаўцы С. Вольскі, А. Уласаў, Я. Купала. Мела больш за 3 тыс. пастаяных і часовых карэспандэнтаў у павятовых і губернскіх гарадах, мястэчках і вёсках Беларусі, у Расіі, за мяжой. У газеце былі наступныя рубрыкі «З Беларусі і Літвы», «Аб усім па троху», «З усіх старон», «Пачтовая скрынка» і інш. Тэматыка, змест і характар падачы апублікаваных матэрыялаў мяняліся ў залежнасці ад палітычнай сітуацыі і складу рэдакцыі. У 1906-1907 гг. шмат месца займалі матэрыялы агітацыйнага і крытычнага зместу. На падставе інфармацыі інспектара па справах друку Віленская судовая палата ў чэрвені 1907 г. пачала судовае праследаванне рэктара Уласава за матэрыялы, апублікаваныя ў № 8 (артыкулы «Дума і народ», «Зямельная справа ў Новай Зеландыі», верш Я. Коласа «Расійскія абразы»), № 9 (артыкул «Работа Думы») і № 12 (перадавіца «Дзяржаўная

Дума), а таксама за аператыўна-інфармацыйныя рубрыкі. Рэдактар абвінавачваўся у тым, што апублікаваў артыкулы, якія пабуджаюць да бунту і «звяржэння існуючага ў дзяржаве грамадскага ладу». У 1910 г. Уласаў адбыў тэрміновае зняволенне. Адкрытая крытыка царызму і агітацыі на барацьбу за дэмакратычныя рэформы праходзіць праз цыкл артыкулаў Я. Коласа пад псеўданінам Марцін: «Дума і народ», № 24.02.1907 г.; «Партыі ў Думе», № 10, 9.03.1907 г. і інш. Газета арыентавала на абарону правоў і свабод бел. працоўнага народа – сялян, наёмных рабочых, рамеснікаў, народнай інтэлігенцыі, яўрэйскай беднаты (цыкл артыкулаў «Аб жыдах», 4.05.1907 г., «Агранічэнні ў законах аб жыдах», 21.07.1907 г. і інш), падпісаных крыптаграмай «З», верагодна «З. Бядуля». Наша Ніва асуджала рэпрэсіі супраць удзельнікаў вызваленчага руху («Судзебныя і адміністраціўныя кары ў 1905-1907гг.», 26.10.1907 г. і інш.), выкрывала дзяржаўную эксплуатацыю сялянства («Аб мужыцкіх павіннасцях», 9.01.1907 г., 13.10.1907 г.), антыбеларускую прапаганду, правакацыі Чарнасоценных палітычных груповак («Аб свабодах», 25.10.107 г., 2.02.1907 г. і інш.). Публікавала на сваіх старонках ці выдавала асобна творы Цёткі, Я. Купалы, Я. Коласа, Ц. Гартнага, З. Бядулі і інш бел. пісьменнікаў, пераклады на беларускую мову некаторых твораў рускіх і польскіх класікаў (Э. Ажэшка “Гэдали”, №№ 11-16, 1907 г, А. Купрын, № 31, 12.10,1907 г і інш.). Важнае месца на яе старонках займалі праблемы вясковага самакіравання, народнай адукацыі, этычнай культуры (№ 15, 13.04.1907 г., № 20, 25.05.1907 г., № 25, 20.07.1907 г., № 28, 31.08.1907 г., № 33, 10.11.1907 г. і інш). Шмат увагі газета аддавала папулярызыцыі прыродазнаўчых, эканамічных, сельска-гаспадарчых і прававых ведаў. Друкавала практычныя рэкамендацыі па земляробству, жывёлагадоўлі, агародніцтву (№ 21, 1(14).06.1907 г., № 27, 17(30).08.1907 г., № 28, 31.08.1907г. і інш.). Газета перастала выходзіць у сувязі з набліжэннем фронту ў першую сусветную вайну да Вільні.

**13.** «**Наша Ніва**» № 11, 12(25).03.1909 г. Друкарня Кухты М. г. Вільня, 1909 г.

**ПГКЗ КП14-10229**

**14. «Полоцкія епархіальныя ведомости»** № 22, 29.05.1911 г. Рэдактары Яноўскі Л., Мацюшэўскі А. Віцебская Губернская Друкарня. г. Віцебск, 1911 г.

«Отчетъ Кирилло-Мефодіевскаго Общества вопомоществованія нуждающимся воспитаникам Витебской духовной семінаріи с 1 мая 1910 г. по 1 мая 1911 г.», с. 200-207.

«Маршрутъ пренесенія частицы мощей Препод. Ефросиніи», с. 207-208.

**ПГКЗ КП16-16382**

Штотыднёвае выданне, орган Полацкай праваслаўнай духоўнай кансісторыі. Выдаваліся ў 1874-1917 гг. у Віцебску на рускай мове. Прызначаліся для Полацкай праваслаўнай епархіі, якая тады тэрытарыяльна адпавядала Віцебскай губерні. Мелі афіцыйны і неафіцыйны аддзелы. У афіцыйным аддзеле друкаваліся пастановы і распараджэнні ўрада і мясцовых улад па справах, рашэнні і справаздачы Сінода, аб'явы і распараджэнні кансісторыі. У неафіцыйнай частцы друкаваліся матэрыялы, прысвечаныя гісторыі і традыцыям праваслаўнай царквы на Віцебшчыне, гісторыі асобных храмаў і манастыроў. Біяграфічныя нарысы і ўспаміны пра царкоўных дзеячаў, рэцэнзіі на асобныя працы і агляды друку па пытаннях царкоўнай гісторыі і наогул царкоўнага жыцця, агляды і рэламы царкоўнай і свецкай літаратуры. Шмат увагі аддавалася паказу дзейнасці праваслаўных брацтваў, што аднавіліся на Віцебшчыне ў 60-я гады, ролі праваслаўнай царквы ў развіцці народнай адукацыі на Віцебшчыне. Рэдактары: М.Красавіцкі, М. Багародскі, М. Бярэнскі. У 1995 г. выданне адноўлена.

**15. «Полоцкія епархіальныя ведомости»** № 48, 25.11.1912 г. Рэдактары Яноўскі Л., Мацюшэўскі А. Віцебская Губернская Друкарня. г. Віцебск, 1912 г.

«Отчётъ о состояніи Полоц. женск. училища духов. ведомства въ учебно-воспитательномъ отношеніи за 1911-1912 годъ», с. 588-607.

«Витебское Св.-Владимирское Епархиальное Братство за 25 летъ его существованія. Летопись Ведомостей», с. 930-949.

**ПГКЗ КП16-383**

**16.** «**Прибавленіе къ № 126** «**Витеб. губер. ведом.**», 9.06.1911 г., Форма № 1 Віцебская Губернская Друкарня. Віцебск, 1911 г.

«Списокъ лицъ, владеющихъ въ Полоцкомъ уезде, Витебской губерніи, обложенною земскимъ сборомъ землёю въ количестве не менее 100 дес. или другимъ недвижемымъ имуществомъ, оцененымъ не ниже 7500 руб. и имеющихъ право участвовать по этому владенію в I отд. (въ составе избирателей непольск. происхожденія) земскаго избирательнаго собранія по Полоцкому уезду, для избранія уездныхъ земскихъ гласныхъ на 3-летіе съ 1911 года.»

**ПИАЗ КП8-4568**

Выдаваліся асобна на рускай мове ў Віцебску з 1838 па 1917 гг. Яны выходзілі па некалькі штук да асобных нумароў, аб'ёмам дзве і болей старонак у Віцебскай друкарні. Некаторыя з іх былі падпісаны Старшынёй Полацкай Павятовай Земскай Управы фон Фальцінам або Гарадскім Галавой г.Веліж Малянком. У іх друкаваліся аб'явы пра гандаль, цэны на прадукты, спісы асоб па выбарах павятовых земскіх гласных, паведамленні пра хваробы жывёл і інш. падобныя матэрыялы. Гэтымі паведамленнямі выдаўцы стараліся зацікавіць сваіх чытачоў. У 1911 г. да № 125 ад 8.06, № 126 ад 9.06 і № 128 ад 11.06 выдаваліся спісы асоб, якія валодалі ў Полацкім, Дрысенскім або Себежскім паветах Віцебскай губерні зямлёй, абкладзенай земскім зборам, і мелі права прымаць удзел па гэтым уладанні ў першым або другім аддзяленні земскага выбарнага сходу або быць абранымі павятовымі земскімі гласнымі на 3 гады. У 1912 г. да № 10 ад 4.08 выдаваліся спісы асоб, якія мелі права прымаць удзел у Дзяржаўнай Думе па Полацкаму павету і ад г. Веліжа ў складзе асоб розных нацыянальнасцей. Ніякія дапаўненні ў спісы не дазваляліся.

**17.** «**Прибавленіе къ № 126** «**Витеб. губер ведом.**», 9.06.1911 г., Форма № 2 Віцебская Губернская Друкарня. Віцебск, 1911 г.

«Списокъ лицъ, владеющихъ въ Полоцкомъ уезде, Витебской губерніи, обложенною земскимъ сборомъ землёю въ количестве на менее 100 десятинъ или другимъ недвижемымъ

имуществомъ, оценнымъ не ниже 7 тыс. 500 руб, и имеющихъ право участвовать по этому владенію во II отделеніи (въ составе избирателей польскаго происхожденія) земскаго избирательнаго собранія по Полоцкому уезду, Витебской губерніи, для избранія уездныхъ земскихъ гласныхъ на 3-летіе съ 1911 года.»

**ПИАЗ КП8-4569**

**18.** «**Прибавленіе къ № 126** «**Витеб. губер. ведом.**», 9.06.1911 г., Форма № 4 Віцебская Губернская Друкарня. Віцебск, 1911 г.

«Списокъ лицъ, владеющихъ въ Полоцкомъ уезде, Витебской губерніи, обложенною земскимъ сборомъ землёю въ количестве не менее 20 дес. или другимъ недвижемымъ имуществомъ, оцененымъ не ниже 1500 руб, и имеющихъ право участвовать по этому владенію въ I отделеніи I земскаго избирательнаго съезда по Полоцкому уезду,Витебской губерніи, для выбора уполномоченныхъ въ I отделеніе земскаго избирательнаго собранія для избранія уездныхъ земскихъ гласныхъ на 3-летіе съ 1911 года.»

**ПИАЗ КП8-4570**

**19.** «**Прибавленіе къ № 126** «**Витеб. губер. ведом.**», 9.06.1911 г., Форма № 5 Віцебская Губернская Друкарня. Віцебск, 1911 г.

«Списокъ лицъ, владеющихъ въ Полоцкомъ уезде, Витебской губерніи, обложенною земскимъ сборомъ землёю въ количестве не менее 20 дес. или другимъ недвижемымъ имуществомъ, оцененымъ не ниже 1500 руб, и имеющихъ право участвовать по этому владенію въ II отделеніи (въ составе избирателей польскаго происхожденія) I земскаго избирательнаго съезда по Полоцкому уезду,Витебской губерніи, для выбора уполномоченныхъ въ II отделеніе земскаго избирательнаго собранія для избранія уездныхъ земскихъ гласныхъ на 3-летіе съ 1911 года.»

**ПИАЗ КП8-4571**

**20.** «**Прибавленіе къ № 126** «**Витеб. губер. ведом.**», 9.06.1911 г., Форма № 6 Віцебская Губернская Друкарня. Віцебск, 1911 г.

«Списокъ лицъ, владеющихъ въ Полоцкомъ уезде, Витебской губерніи, обложенною земскимъ сборомъ землёю въ количестве от 20 до 10 дес. или другимъ недвижемымъ имуществомъ, оцененымъ от 700 до 1000 руб, и имеющихъ право участвовать по этому владенію въ I отделеніи (въ составе избирателей непольскаго происхожденія) II земскаго избирательнаго съезда по Полоцкому уезду, Витебской губерніи, для выбора уполномоченныхъ въ I отделеніе земскаго избирательнаго собранія для избранія уездныхъ земскихъ гласныхъ на 3-летіе съ 1911 года.»

**ПИАЗ КП8-4572**

**21.** «**Прибавленіе къ № 126** «**Витеб. губер. ведом.**», 9.06.1911 г., Форма № 7 Віцебская Губернская Друкарня. Віцебск, 1911 г.

«Списокъ лицъ, владеющихъ въ Полоцкомъ уезде, Витебской губерніи, обложенною земскимъ сборомъ землёю въ количестве от 10 до 20 дес. или другимъ недвижемымъ имуществомъ, оцененымъ от 700 до 1000 руб, и имеющихъ право участвовать по этому владенію въ II отделеніи (въ составе избирателей польскаго происхожденія) II земскаго избирательнаго съезда по Полоцкому уезду,Витебской губерніи, для выбора уполномоченныхъ въ II отделеніе земскаго избирательнаго собранія для избранія уездныхъ земскихъ гласныхъ на 3-летіе съ 1911 года.»

**ПИАЗ КП8-4573**

**22.** «**Прибавленіе къ № 10** «**Витеб. губер. ведом.**», 4.08.1912 г. Віцебская Губернская Друкарня. Віцебск, 1912 г.

«Списокъ лицъ, имеющихъ право участія въ выборахъ въ Гос. Думу на съезде уездныхъ землевладельцевъ Полоцкаго уезда, въ составе лицъ рус. и прочихъ національностей, кроме лицъ польск. національности. Председатель Полоцкой Земельной Управы фон-Фальтин.»

**ПИАЗ КП8-4574**

**23. «Прибавленіе къ № 10 «Витеб. губер. ведом.»**, 4.08.1912 г. Віцебская Губернская Друкарня. Віцебск, 1912 г.

«Списокъ лицъ, имеющихъ право участія въ выборахъ въ Гос. Думу на съезде уездныхъ землевладельцевъ Полоцкаго уезда, въ составе лицъ польск. Национальности. Председатель Полоцкой Земельной Управы фон-Фальтин.»

**ПИАЗ КП8-4575**

**24. «Прибавленіе къ № 10 «Витеб. губер. ведом.»**, 4.08.1912 г. Віцебская Губернская Друкарня. Віцебск, 1912 г.

«Списокъ лицъ, имеющихъ право участія въ выборахъ въ Гос. Думу на предварительномъ съезде уездныхъ землевладельцевъ Полоцкаго уезда, въ составе лицъ рус. и провосл. национальностей, кроме лицъ польск. национальности, по владенію землёю или инымъ имуществомъ, въ размере полнаго ценза, но не ценее 1/5 ценза. Председатель Полоцкой Земельной Управы фон-Фальтин.»

**ПИАЗ КП8-4576**

**25. «Прибавленіе къ № 10 «Витеб. губер. ведом.»**, 4.08.1912 г. Віцебская Губернская Друкарня. Віцебск, 1912 г.

«Списокъ лицъ, имеющихъ право участія въ выборахъ въ Гос. Думу на предварительномъ съезде уездныхъ землевладельцевъ Полоцкаго уезда, въ составе лицъ польск. национальности, по владенію землёю или инымъ имуществомъ, въ размере менее полнаго ценза, но не ниже 1/5 ценза. Председатель Полоцкой Земельной Управы фон-Фальтин.»

**ПИАЗ КП8-4577**

**26. «Прибавленіе къ № 10 «Витеб. губер. ведом.»**, 4.08.1912 г. Віцебская Губернская Друкарня. Віцебск, 1912 г.

«Списокъ лицъ, имеющихъ право участія въ выборахъ въ Гос. Думу на предварительномъ съезде уездныхъ землевладельцевъ Полоцкаго уезда, въ составе лицъ рус.и правосл. национальностей, по владенію землёю или инымъ имуществомъ, въ размере менее полнаго ценза, но не ниже 1/5 ценза Председатель Полоцкой Земельной Управы фон-Фальтин.»

**ПИАЗ КП8-4578**

**27. «Прибавленіе къ № 10 «Витеб. губер. ведом.»**, 4.08.1912 г. Віцебская Губернская Друкарня. Віцебск, 1912 г.

«Списокъ лицъ, имеющихъ право участія въ выборахъ въ Гос. Думу на предварительномъ съезде уездныхъ землевладельцевъ Полоцкаго уезда, въ составе лицъ польск. национальности, по владенію землёю или инымъ имуществомъ, въ размере менее 1/5 полнаго ценза. Председатель Полоцкой Земельной Управы фон-Фальтин.»

**ПИАЗ КП8-4579**

**28. «Прибавленіе къ № 128 «Витеб. губер. ведом.»**, 11.06.1911 г., Форма № 1 Віцебская Губернская Друкарня. Віцебск, 1911 г

«Списокъ лицъ, владеющихъ въ Дрисенскомъ уезде, Витебской губерніи, обложенною земскимъ сборомъ землёю въ количестве не менье 100 дес. или другимъ недвижимымъ имуществомъ, оцененымъ не ниже 7500 руб. и имеющихъ право участвовать по этому владенію в I отд. (въ составе избирателей непольск. Происхожденія) по Дриссенскому уезду, Витебской губерніи земск. избират. собранія, для избранія уезд. земск. гласныхъ на 3-летіе съ 1911 года.»

**ПИАЗ КП8-4580**

**29. «Прибавленіе къ № 128 «Витеб. губер. ведом.»**, 11.06.1911 г., Форма № 2 Віцебская Губернская Друкарня. Віцебск, 1911 г.

«Списокъ лицъ, владеющихъ въ Дриссенскомъ уезде, Витебской губерні, обложенною земскимъ сборомъ землёю въ количестве не менье 100 дес. или другимъ недвижимымъ имуществомъ, оцененымъ не ниже 7500 руб. и имеющихъ право участвовать по этому владенію в II отд. (въ составе избирателей польск. происхожденія) по Дриссенскому уезду, Витебской губерни земск. избират. собранія, для избранія уезд. земск. гласныхъ на 3-летіе съ 1911 года.»

**ПИАЗ КП8-4581**

**30. «Прибавленіе къ № 128 «Витеб. губер. ведом.»**, 11.06.1911 г., Форма № 4 Віцебская Губернская Друкарня. Віцебск, 1911 г.

«Списокъ лицъ, владеющихъ въ Дриссенскомъ уезде, Витебской губерніи, обложенною земскимъ сборомъ землёю въ количестве не менее 20 дес. или другимъ недвижимымъ имуществомъ, оцененымъ не ниже 1500 руб. и имеющихъ право участвовать по этому владенію в I отд. (въ составе избирателей непольск. происхожденія) II земскаго избирательнаго съезда по Дриссенскому уезду, Витебской губерніи, для выбора уполномоченныхъ въ I отделеніе земскаго избирательнаго собранія для избранія уезд. земск. гласныхъ на 3-летіе съ 1911 года.»

**ПИАЗ КП8-4582**

**31.** «**Прибавленіе къ № 128** «**Витеб. губер. ведом.**», 11.06.1911 г., Форма № 5 Віцебская Губернская Друкарня. Віцебск, 1911 г.

«Списокъ лицъ, владеющихъ въ Дрисенскомъ уезде, Витебской губерні, обложенною земскимъ сборомъ землёю въ количестве не менее 20 дес. или другимъ недвижимымъ имуществомъ, оцененымъ не ниже 1500 руб. и имеющихъ право участвовать по этому владенію в II отд. (въ составе избирателей польск. происхожденія) I земскаго избирательнаго съезда по Дриссенскому уезду, Витебской губерніи, для выбора уполномоченныхъ въ II отделеніе земскаго избирательнаго собранія для избранія уезд. земск. гласныхъ на 3-летіе съ 1911 года.»

**ПИАЗ КП8-4583**

**32.** «**Прибавленіе къ № 128** «**Витеб. губер. ведом.**», 11.06.1911 г., Форма № 6 Віцебская Губернская Друкарня. Віцебск, 1911 г.

«Списокъ лицъ, владеющихъ въ Дрисенскомъ уезде, Витебской губерні, обложенною земскимъ сборомъ землёю въ количестве менье 20 дес., но не менее 10 дес. или другимъ недвижимымъ имуществомъ, оцененымъ от 700 до 1500 руб. и имеющихъ право участвовать по этому владенію в I отд. (въ составе избирателей непольск. происхожденія) II земскаго избирательнаго съезда по Дриссенскому уезду, Витебской губерніи для выбора уполномоченныхъ въ I отделеніе земскаго избирательнаго собранія для избранія уезд. земск. гласныхъ на 3-летіе съ 1911 года.»

**ПИАЗ КП8-4584**

**33. «Прибавленіе къ № 128 «Витеб. губер. ведом.»**, 11.06.1911 г., Форма № 7 Віцебская Губернская Друкарня. Віцебск, 1911 г.

«Списокъ лицъ, владеющихъ въ Дрисенскомъ уезде, Витебской губерніи, обложенною земскимъ сборомъ землёю въ количестве менее 20 дес., но не менее 10 дес. или другимъ недвижимымъ имуществомъ, оцененымъ от 700 до 1500 руб. и имеющихъ право участвовать по этому владенію в II отд. (въ составе избирателей польск. происхожденія) II земскаго избирательнаго съезда по Дриссенскому уезду, Витебской губерніи для выбора уполномоченныхъ въ II отделеніе земскаго избирательнаго собранія для избранія уезд. земск. гласныхъ на 3-летіе съ 1911 года.»

**ПИАЗ КП8-4585**

**34. «Прибавленіе къ № 125 «Витеб. губер. ведом.»**, 8.06.1911 г., Форма № 7 Віцебская Губернская Друкарня. Віцебск, 1911 г.

«Списокъ лицъ, владеющихъ въ Себежскомъ уезде, Витебской губерніи, обложенною земскимъ сборомъ землёю въ количестве от 15 до 30 дес. или другимъ недвижимымъ имуществомъ, оцененымъ от 700 до 1500 руб. и имеющихъ право участвовать по этому владенію в II отд. (въ составе избирателей польск. происхожденія) II земскаго избирательнаго съезда по Себежскому уезду, для выбора уполномоченныхъ въ II отделеніе земскаго избирательнаго собранія для избранія уезд. земск. гласныхъ на 3-летіе съ 1911 года.»

**ПИАЗ КП8-4586**

**35. «Прибавленіе къ № 10 «Витеб. губер. ведом.»**, 4.08.1912 г. Віцебская Губернская Друкарня. Віцебск, 1912 г.

«Списокъ лицъ, имеющихъ право участія въ выборахъ въ Гос. Думу по I съезду городскихъ избирателей города Велижа. Городской Голова Маленок.»

**ПИАЗ КП8-4587**

## Дададак

**1.** «**Наша доля**». Падшыўка газет. №№ 1-6, 1906 г. Рэдактар – Іван Тукеркес. Выдаўцы – Іван Тукеркес, Адам Гедвіла. Друкарня «Аттель Печатнаго Дъла». Вільня, 1906 г.

Факсімільнае выданне. 52 с.

Выдавецтва «Навука і тэхніка». Друкарня імя Ф. Скарыны. Мінск, 1991 г.

«З Беларусі і Літвы» (паведамленне пра прадвыбарныя з'езды мужыкоў у Віцебскай губерні), № 6, с. 5.

**ПИКЗ КП12-7239-7243** (5 экз.)

Штотыднёвая грамадска-палітычная і літаратурная газета, першае легальнае перыядычнае выданне на беларускіх землях. Выдавалася з 1(14).09 да 1(14).12.1906 г. у Вільні кірыліцай і лацінкай. Рэдактар-выдавец І.А. Тукеркес, з 18.11.1906 г. за рэдактара А. Гедвіла. Друкавала востра публіцыстычныя артыкулы і фельетоны, у якіх выкрывала антынародную палітыку ўрада. Рэвалюцыйна-вызваленчымі ідэямі прасякнуты апублікаваныя ў газеце творы Цёткі пад псеўданімам Крапіўка, Я. Коласа (некаторыя апавяданні пад псеўданімам Дзядзька Карусь), Ядвігіна Ш. У рубрыках «Усяго па троху», «З Беларусі і Літвы», «Па Расіі» інфармавала чытачоў пра вызваленчы рух, урадавыя рэпрэсіі, барацьбу сялян за беларускую школу і інш.Апублікаваны шэраг сельскагаспадарчых і навукова-асветніцкіх нарысаў. Пасля 4-га нумара ў выніку расколу рэдакцыі і заснавання газеты «Наша ніва» літаратурны аддзел «Нашай долі» аказаўся аслабленым. З шасці нумароў «Нашай долі» чатыры былі канфіскаваны, за 1, 3 і 4 нумары рэдактара Тукеркеса прыгаварылі да турэмнага зняволення на 1 год.

**2-3**. «**Наша ніва**». Падшыўка газет. №№ 1-7, 1906 г. №№ 1-23, 1907 г. №№ 1-26, 1908 г. Рэдактар-выдавец З. Вольскі (№№ 1-4, 1906 г.), А. Уласаў (№№ 5-7, 1906 г.; 1907 г. ;1908 г.). Друкарня М. Кухты. г. Вільня.

Факсімільнае выданне.

Выдавецтва «Навука і тэхніка». Друкарня імя Ф.Скарыны. Мінск, 1992 г.

«З Беларусі і Літвы» (паведамленне пра з'езд настаўнікаў Віцебскай губерні), № 2,1908 г., с. 6.

«З Беларусі і Літвы» (паведамленні пра цяжкае становішча ў Віцебскай Губерні ў сувязі з дрэнным ураджаем збожжа і суровай зімою), № 3, 1908 г., с. 7; № 24, 1908 г., с. 7.

Артыкулы пра кнігі, выдадзеныя выдавецтвам «Загляне сонца і ў наша аконца», № 7, 1908 г., с. 8; № 9, 1908 г., с. 8.

«З Беларусі і Літвы» (паведамленні пра сельскагаспадарчую выстаўку ў мястэчку Ушачы), № 15, 1908 г., с. 7; № 20, 1908 г., с. 6.

«З Беларусі і Літвы» (паведамленне пра набор у войска па Віцебскай губерні), № 20, 1908 г., с. 5.

Навукова-папулярны артыкул «Белавежская пушча» з фотаздымкамі, № 24, 1908 г., с. 5-6.

**ПИКЗ КП13-9206**

**ПИКЗ КП13-9039**

**4.** «**Наша ніва**». Падшыўка газет. №№ 1-38, 1909 г. Рэдактар-выдавец А. Уласаў. Друкарня М. Кухты. г. Вільня. 1909г.

Факсімільнае выданне.

Выдавецтва «Беларуская навука». Мінск, 1996 г.

Нумар-кніжка. «Дорошэнко Д. Беларусы і іх нацыональнае адрадзэньне», № 4.

Прадмова да кнігі Д. Дарашэнкі «Ад Перакладчыка» Янкі Журбы, № 4, с. 49-62.

Артыкул пра адкрыццё «Беларускага Выдаўніцкага Таварыства «Наша хата», № 4, с. 62-64.

Нумар-кніжка. «Аб гаспадарцы на хутары і на шнурах», №№ 6-7, с. 82-100.

Артыкул «Аб ткацтве на Беларусі», № 9, с. 124-126.

Я. Журба «Лісты з Украіны», № 14, с. 200-202; № 15, с. 211-212; № 16, с. 229-230; № 19, с. 279-281; № 23, с. 339-340.

«З Беларусі і Літвы» (паведамленне пра святкаванне 100-гадовай гадаўшчыны з дня нараджэння М.Гогаля ў Полацкай настаўніцкай семінарыі 20 сакавіка 1909 года), № 15, с. 220.

Артыкулы пра панаванне халеры ў Полацку і навакольных землях, № 30, с. 446; №№ 31-32, с. 461-462; №№ 35-36, с.512-515; № 38, с. 554.

«З Беларусі і Літвы» (паведамленне пра ткацкую школу ў Дзісне), № 37, с. 528.

«Умовы «Беларускай выдаўніцкай суполкі «Загляне сонцэ і ў нашэ ваконцэ», № 43, с. 629-632.

Рэкламныя звесткі пра першы Беларускі каляндар на 1910 год, №№ 44-52.

Матэрыялы, прысвечаныя 3-годдзю газеты «Наша ніва», №№ 46-49.

Паведамленне пра тое, як у г. Пергаме знайшлі каралеўскі ўказ, напісаны дзве тысячы гадоў да н.э., №№ 51-52, с. 763.

**ПГКЗ КП14-11832**

**Літаратура**

**Александровіч С.Х.** Пуцявіны роднага слова. Мн.: БДУ ім. У.І. Леніна, 1971.

**Беларуская журналистика** (1563-1917 гг.). Учебно-методическое пособие для студентов иностранного отделения факультета журналистики. Мн.: 1997. с. 8.

«**Витебский Вестник**».// Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т 2. Мн., 1985. с. 307.

«**Витебские губернские ведомости**».// Энцыклапедыя гісторыи Беларусі: У 6 т. Т 2. Мн., 1985. с. 306-307.

**Зубчонак Н.А.** «Беларускі друк у перыяд станаўлення нацыянальна-дэмакратычнага руху (1906-1907 гг.). Мн., 2001, с. 11.

**Кавалеўскі П.В.** Полацкая газета.//Памяць. Полацк. Мн.: Бел. энцыклапедыя, 2002. с. 714.

**Конан У.** «Наша ніва».// Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т 5. Мн., 1999. с. 314-316.

«**Литовскія Епархіальныя Ведомости**».// Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т 4. Мн., 1987. с. 382.

«**Наша доля**».// Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6т. Т 5. Мн., 1999. с. 313.

«**Наша ніва**».// Кніга Беларусі: 1517-1917. Зводны каталог. Мн.: БелСЭ, 1986. с. 268.

«**Полоцкие Епархіальныя Ведомости**».// Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : У 6 т. Т 4. Мн., 1999. с. 544.

«**Прибавленія къ «Витебскимъ Губернскимъ Ведомостямъ**».// Кніга Беларусі: 1517-1917. Зводны каталог. Мн.: БелСЭ, 1986. с. 522.

**Слука А.Г.** «Беларуская журналістыка. Вучэбны дапаможнік. У 3-х частках. Ч. 1. Мн., 2000, с. 161.

# Агляд калекцыі меднага мастацкага ліцця (XI-XX стст.) са збору НПГКМЗ

***В.М. Даўгун***

Меднае мастацкае ліццё – найцікавейшая з’ява хрысціянскай культуры. Першапачаткова медналітыя абразы, крыжы, складні ўвозіліся з Візантыі. Грэчаскія ўзоры капіраваліся і перапрацоўваліся ў залежнасці ад густаў і патрэб насельніцтва. Прастата тэхналогіі, таннасць матэрыялу, лёгкасць прыгатавання ліцейных формаў спрыялі таму, што выраб прадметаў меднага ліцця набыў рамесніцкі характар. Таму ўзоры медналітой пластыкі часцей разглядаліся з пункту гледжання рыначнага, а не мастацкага кошту. Напэўна, па гэтай прычыне, вывучэнню меднага ліцця адведзена зусім нязначнае месца.

Толькі параўнальна нядаўна даследчыкі звярнуліся да вывучэння медналітых помнікаў, што дазволіла выявіць асаблівасць і значэнне гэтага віду рэльефнай мініяцюры.

Меднае мастацкае ліццё перш за ўсё з’яўляецца гістарычнай крыніцай. Пры вывучэнні дробнай пластыкі можна выявіць сувязь яе ўзораў з пэўнымі гістарычнымі падзеямі, па іх можна вызначыць вобласці найбольшага ўшанавання асобных святых. Акрамя таго, вырабы дробнай пластыкі як масавага віду мастацтва вылучаюцца разнастайнасцю іканаграфіі, што дазваляе значна пашырыць уяўленне аб характары выяў тых ці іншых сюжэтаў і святых.

У медным ліцці ў большай ступені, чым у другіх відах выяўленчага мастацтва сустракаецца адыходжанне ад царкоўных канонаў, адлюстроўваюцца своеасаблівасці розных школ і майстэрняў.

Аднак медналітыя прадметы цікавыя для нас не толькі як культавы гістарычны матэрыял, але і як мастацкія каштоўнасці, якія адлюстроўваюць уяўленні аб прыгажосці і густы людзей свайго часу.

У складзе калекцыі меднага мастацкага ліцця НПГКМЗ – паступленні Полацкага краязнаўчага музея і Полацкага гісторыка-археалагічнага запаведніка, фонды якіх былі аб’яднаны ў 1985 годзе. Перыяд фарміравання калекцыі скла-

дае больш за 30 год, пачынаючы з першага паступлення ў 1959 г. крыжа-цельніка (**КП5-2297**). За гэты час склалася калекцыя, якая на дадзены момант налічвае 38 помнікаў.

Большая частка паступленняў (31 прадмет) прыпадае на 1980-1990 гады, што складае каля 82 % усяго збору.

Калекцыя фарміравалася на аснове розных крыніц паступлення. Значную частку фонду меднага ліцця складаюць экспанаты, закупленыя ў прыватных асоб і ў антыкварных магазінах (18 адз.).

Шэсць прадметаў знойдзены пры археалагічных раскопках, якія актыўна праводзіліся на тэрыторыі Полацка і Полацкага раёна.

10 прадметаў перададзены ў дар ад прыватных асоб і арганізацый.

3 крыжы-цельнікі паступілі з раней неапрыходаваных матэрыялаў.

Адзін крыж кіётны быў перададзены мытнымі службамі г. Брэста.

Аб разнастайнасці фонду меднага ліцця сведчыць склад калекцыі, якая ўключае:

- крыжы-цельнікі і іх фрагменты (9 адз.)
- крыж нагрудны (1 адз.)
- крыж энкалпіён (1 адз.)
- крыжы напрастольныя (3 адз.)
- крыжы кіётныя (2 адз.)
- змеявік (1 адз.)
- абразы (13 адз.)
- абразы складаныя двухстворкавыя (2 адз.)
- абразы складаныя трохстворкавыя і іх фрагменты (3 адз.)
- абразы складаныя чатырохстворкавыя і іх фрагменты (3 адз.)

Найбольш раннія медналітыя вырабы збору знаходзяцца ў складзе археалагічнай калекцыі НПГКМЗ. Гэта два чатырохканцовыя роўнастаронніх крыжы-цельнікі датаваныя XI-XII стст. (**КП8-4347/18** і **КП16-16556**).

Да XII (XI) ст. адносіцца і крыж-энкалпіён (**КП2-16704**) – двухстворкавы нагрудны крыж для захавання мошчаў. Рэльефная выява на ім Распяцця Хрыстова і Багародзіцы інкруставаны серабром.

XI-XIII стст. датаваны яшчэ адзін крыж-цельнік (**КП5-2334/6**), які знаходзіцца ў пастаяннай экспазіцыі Полацкага Краязнаўчага музея.

Да перыяду XIII-XV стст адносяцца: крыж-цельнік (**КП-3178**), фрагмент крыжа-цельніка (**КП2-1256**), абраз з выявай двух святых (**КП2-1257**) і змеявік (**КП16-16532**), які адлюстроўвае пераходны этап ад язычніцсва да хрысціянства.

Некалькі прадметаў датаваны XVI-XVIII стст. Гэта два крыжы-цельнікі (**КП4-2107**; **КП17-1927/а,б**) і нагрудны крыж з гарэл'ефнай выявай Распятага Хрыста (**КП15-15610**).

Самая шматлікая група помнікаў (26 адз.) адносяцца да XVIII-XIX стст. Пачаткам XX ст. датаваны крыж напрастольны «Распяцце Хрыстова» (**КП9-5344**).

Большую частку збору займае ліццё XVIII-XIX стст., звязанае са стараверскімі майстэрнямі. Аналіз твораў калекцыі дазваляе вызначыць іх выгаўскае, гусліцкае або маскоўскае паходжанне, ці прызнаць, што яны, безумоўна, ўзыходзяць да ўзораў гэтых цэнтраў медналітой пластыкі.

Значная колькасць прадметаў (15 адз.) упрыгожана эмалямі ў адзін, два, тры колеры. Чатыры віды эмаляў выкарыстоўваюцца на крыжы «Распяцце Хрыстова» (**КП9-5344**) і на крыжы кіётным «Распяцце Хрыстова з прадстаячымі» (**КП3-799**). Складзень «Дванадзесятыя святы» (**КП8-4798**) аздоблены эмаллю пяці колераў.

Калекцыя мастацкага меднага ліцця ўяўляецца далёка не поўна сфарміраванай і зусім мала вывучанай, таму патрабуецца вялікая праца па яе далейшым фарміраванні і вывучэнні.

І апошняе, на часовым захоўванні ў НПГКМЗ, у дадзены момант знаходзяцца 14 медналітых абразоў і складняў, перададзеных з мытні г. Брэста. Магчыма, што ў хуткім часе яны папоўняць калекцыю запаведніка.

Шэраг абставін робяць састаўленне каталога меднага ліцця даволі складаным. Галоўная складанасць – слабая вывучанасць меднага ліцця. Незразумелы і сам падыход да яго вывучэння. Традыцыйныя метады аказваюцца малапрыгоднымі, бо размова ідзе аб тыражыраваных вырабах, якія падаўляюць колькасцю і варыятыўнасцю. Вызначэнне часу стварэння,

рэгіёну або цэнтра вырабу прадмета таксама ўскладнена шматступеньчатым пераўзнаўленнем адных і тых жа ўзoраў.

Найбольш прымальнымі з'яўляюцца наступныя прынцыпы класіфікацыі меднай пластыкі:

- тыпалагічны – з-за тыражыравання і выкліканай ім устойлівай іканаграфіі;
- храналагічны – з прычыны тэрміновасці яе існавання.

Класіфікацыя па тапаграфічнаму прынцыпу ўскладнена распаўсюджанасцю помнікаў з аднолькавымі стылістычнымі асаблівасцямі, чаму спрыяла прынятая ў практыцы ліцейнай вытворчасці работа па ўзорах-мадэлях.

Узаемасувязь прынцыпаў абумовіла комплексны падыход да класіфікацыі.

У аснову структуры каталога пакладзены тыпалагічны, храналагічны і іканаграфічны прынцыпы.

Каталог складаецца з трох раздзелаў з адзінай нумерацыяй: «Крыжы», «Абразы», «Абразы складаныя».

Раздел «Крыжы» мае падраздзелы:

- крыжы нацельныя і нагрудныя;
- крыжы напрастольныя;
- крыжы кіётныя.

Раздзел «Абразы», куды асобным падраздзелам уключаны змеявік, арганізаваны паводле іканаграфічнага прынцыпу:

- іканаграфія Багародзіцы;
- іканаграфія святых;
- святочны цыкл.

Раздзел «Абразы складаныя» ўключае ў сябе:

- абразы складаныя двухстворкавыя;
- абразы складаныя трохстворкавыя;
- абразы складаныя чатырохстворкавыя.

Унутры кожнай тыпалагічнай або іканаграфічнай групы помнікі размешчаны ў храналагічным парадку.

## Літаратура

**Алексеев Л.В.** Мелкое художественное литьё из некоторых западно-русских земель: Кресты и иконки Белоруссии.// Советская археология. 1974, № 3, с.204-223.

**Апостолос-Каппадона Д.** Словарь христианского искусства. Челябинск, 2000.

**Арэалогія Беларусі.** У 4 т. Т. 3. Сярэдневяковы перыяд (IX-XIII стст.)/ Я.Г. Звяруга, Т.М. Каробушкіна, П.Ф.Лысенка, Г.В. Штыхаў, Навук. рэд. П.Ф. Лысенка. Мн.: Беларуская навука, 2000, с. 482.

**Винокурова Э.П.** Литая медная пластика конца XVII –начала XX в. Введение в типологию.// Древнерусская скульптура : Проблемы и атрибуция./ Под ред. А.В. Рындиной. Вып. 1-2. М.: НИИРАХ, 1993, с. 188-216.

**Винокурова Э.П.** Модель четырехстворчатого складня// Древнерусская скульптура: Проблемы и атрибуции./ Редактор -сост. А.В. Рындина. М., 1991, Вып. 1, с. 125-178.

**Винокурова Э.П.** Поморские датированные складни.// Памятники культуры. Новые открытия: Ежегодник. 1988. М., 1989, с. 338-345.

**Гнутова С.В., Зотова Е.Я.** Кресты, иконы, складни. Медное художественное литье XI – начала XX века: Альбом. М.: Интербук-бизнес, 2000.

**Земная жизнь Пресвятой Богородицы.**/ Сост. С. Снессорева. Ярославль: Верхняя Волга, 2000.

**Иванов В.Н., Карпенко В.М.** Художественное литье. Учебное пособие. Мн.: Высш. шк, 1999.

**Принцева М.Н.** К вопросу об изучении старообрядческого медного литья в музейных собраниях.// Научно-атеистические исследования в музеях. Л., 1986, с. 47-68.

**Русское медное литье.** Сборник статей. Вып. 1 и 2./ Сост. С.В. Гнутова. М.: Сол Систем , 1993.

**Седова М.В.** Ювелирные изделия древнего Новгорода X-XV в. М.: Наука, 1981.

# Каталог часопісаў «Тыгоднік ілюстраваны» («Tygodnik illustrowany») у фондах НПГКМЗ

*Г.П. Зуева*

Калекцыя часопісаў «Тыгоднік ілюстраваны» у фондах НПГКМЗ налічвае 19 падшывак часопіса, у сярэднім па 23-27 нумароў у кожнай. Храналагічныя рамкі калекцыі 1873-1899гг.

У аснову структурнай пабудовы названай калекцыі пакладзены храналагічны прынцып.

Бібліяграфічнае апісанне ў каталогу складаецца з наступных частак:

**1.** Парадкавы нумар.

**2.** Назва.

**3.** Нумары часопісаў, серыя, том (серыя і том падаецца для тых падшывак, у якіх яны ўказваюцца).

**4.** Рэдактар , выдавец , друкар.

**5.** Месца друку, год выдання, колькасць старонак.

**6.** Кароткі змест.

**7.** Захаванасць.

**8.** Матэрыялы, тэхніка, памеры .

**9.** Уліковы нумар.

Імёны і прозвішчы рэдактараў, выдаўцоў і друкароў, а таксама імёны і прозвішчы людзей, чые біяграфіі змешчаны ў часопісах, падаюцца на беларускай мове, а ў дужках – на польскай.

У рубрыцы «Захаванасць» указваюцца толькі страты.

**1.** Тыгоднік ілюстраваны. Падшыўка №№ 288-312 (з дадаткам да кожнага нумара). Т. 12. Серыя 2. Рэдактар Людвік Енікэ (Ludwik Jenłke). Выдавец і друкар Юзаф Унгэр (Józef Unger). Варшава. 1873. 380 с.

*Змест.*

1) Біяграфіі: Густаў Бэлькэ (Gustaw Belke), Юзаф Лукашэвіч (Józef Lukaszewicz), Севярын Мельжынскі (Seweryn Mielżyński), Эразм Эдвард Рыкашэўскі (Erazm Edward Rykaczewski), Лявон Вэгнэр (Leon Wegner), Саламея Кенігова

(Salomea Kenigowa), Эдвард Бульвэр (Edward Bulwer), Войцэх Якубоўскі (Wojciech Jakubowski), Джузэпе Вердзі (Józef Verdi).

2) Апісанні мясцовасцей, касцёлаў, замкаў, гістарычных мясцін, геаграфічныя падарожжы: Т. Чуленскі «Ліпавецкі замак у Галіцыі»; «Вадапад ў Пірэнеях»; «Львоў»; «Мураваныя Якубовіцы»; Феліцыян Сурын «Лісты з падарожжа па краі» (апісаны барысаўскі, мінскі паветы, Смілавічы, Нясвіж), У.Падлеўскі «Успаміны аб падарожжы па Каўказе»; Я. Кубары «Абразкі з астравоў ў «Вялікім акіяне».

3) Літаратурна-мастацкія творы: раман Ю.І. Крашэўскага «Morituri», празаічныя творы Т. Стэцкага, М. Балуцкага, санеты Пятраркі (у перакладзе Ф. Фаленскага), вершы Адэлі К., У. Смаленскага, Ю. Навакоўскага, Л. Савінскага, Э. Знатовіча і інш.

4) Навуковыя, літаратуразнаўчыя, гістарычныя і іншыя артыкулы: А. Макавецкі «Новыя галіны прамысловасці»; «Акадэмія мастацтваў у Кракаве»; «Кракаўскі тэатр у 1872-1873гг.»; «Апісанні грамадскай дзейнасці, зробленыя гісторыкам Длугашам»; В. Невядомскі «Навейшыя адкрыцці, вынаходніцтвы і навуковыя дасягненні»; В. Марэнэ «Агляд замежнай літаратуры»; «Каляровы друк»; «Балгарскія тыпы» і інш.

5) Агляды: пісьменніцкі (паводле К. Стразбургера), тэатральны (паводле В. Шыманоўскага), мастацкі, музычны (паводле Я. Клячынскага), агляд замежнай палітыкі.

6) Хронікі: месячная, штотыднёвая, замежная хроніка паводле Ю.І. Крашэўскага.

7) Карэспандэнцыя з Львова, Кракава, Амерыкі.

8) Выдавецкія навіны.

*Захаванасць*: страчаны покрыўка, форзац, тытул падшыўкі, сс. 27-32, 85-88, 115-116, 133-134, 153-156, 163-164, 211-214, 237-240, 297-298.

Папера. Тыпаграфскі друк. 37,7х28,6х2,7(58,0) см.

**ПГКЗ КП12-6986**

**2.** Тыгоднік ілюстраваны. Падшыўка №№ 81-105 (з дадаткам да №№ 80-91 у канцы падшыўкі). Т. 4. Серыя 3. Рэдактар Людвік Енікэ (Ludwik Jenike). Выдавец і друкар Юзаф Унгэр (Józef Unger). Варшава. 1877. 428 с.

*Змест.*

1) Біяграфіі: Летыцыя Банапарт (Letycya Bonaparte), Палікарп Гірштаўт (Polikarp Girsztowt), Севярын Галембоўскі (Seweryn Gołębiowski), Адам Якубоўскі (Adam Jakubowski), Аляксандр Котсіс (Aleksander Kotsis), Пётр Магні (Piotr Magni), Ян Матэйка (Jan Matejko), Аляксандр Арлоўскі (Aleksander Orłowski), Пітэр Пауэл Рубенс (Piotr Paweł Rubens).

2) Апісанні мясцовасцей, касцёлаў, замкаў, гістарычных мясцін, геаграфічныя падарожжы: Я. Пілецкі «Мінеральныя воды ў Друскеніках»; А. Банзкевіч «Астранамічная абсерваторыя ў Вільні»; «Бібліятэка ў Ватыкане»; М. Дубецкі «Нашы помнікі ў Харкаве»; Ф. Сурын «Лісты з падарожжа па краі» (апісваецца Гродна, Беласток); «Пулавы і іх ваколіцы».

3) Літаратурна-мастацкія творы: празаічныя творы Т. Ежа, Веліслава, раман Ньюмэна «Яніна», вершы Яшкоўскага, Ю. Свянціцкага, К. Падвысоцкага, М. Канапніцкай, Гётэ (у перакладзе Л. Енікэ).

4) Навуковыя, гістарычныя, літаратуразнаўчыя і іншыя артыкулы: «Літаратурныя даследванні»; «Аб карысці археалагічных навук»; Райнах «Гістарычны ўплыў Францыі на Германію»; «Аб'яднанне літаратараў Францыі»; К. Лучыцкі «Чэшская літаратура»; Г. Спенцэр «Грамадскія навукі»; Э. Пэрэр «Род людскі»; Ф. Сулімерскі «Тэлефон»; матэрыялы да юбілею Ю.І. Крашэўскага.

5) Агляды: пісьменніцкі, тэатральны (паводле У. Наскоўскага), музычны, выяўленчага мастацтва, палітычны (у кожным нумары).

6) Хронікі: замежная,парыжская, штотыднёвая (у кожным нумары).

7) Карэспандэнцыя з Пецярбурга, Познані, Кракава, Львова,Венецыі.

8)Бібліяграфічныя матэрыялы.

*Захаванасць*: страчаны сс.1-16, 57-58, 109-110, 135-138, 231-234, 247-248, 325-332, фрагменты с. 25-26 (9,0х5.7 см.), 169-170 (11,3х27,2 см.), 177-178 (14,9х27,2 см.).

Папера, кардон, скура. Тыпаграфскі друк. 37,5х28,5х3,3(58,0) см.

**ПГКЗ КП12-6981**

**3.** Тыгоднік ілюстраваны. Падшыўка №№ 80-105. Т. 4.Серыя 3. Рэдактар Людвік Енікэ (Ludwik Jenike). Выдавец і друкар Юзаф Унгэр (Józef Unger). Варшава. 1877. 368 с.

*Змест.*

1) Біяграфіі: Летыцыя Банапарт (Letycya Bonaparte), Палікарп Гірштаўт (Polikarp Girsztowt), Севярын Галембоўскі (Seweryn Gołęmbiowski), Адам Якубоўскі (Adam Jakubowski), Аляксандр Котсіс (Aleksander Kotsis), Пётр Магні (Piotr Magni), Ян Матэйка (Jan Matejka), Аляксандр Арлоўскі (Aleksander Orłowski), Пітэр Пауэл Рубенс (Piotr Paweł Rubens), Люцыян Сяменскі (Lucyan Siemieński).

2) Апісанні мясцовасцей, касцёлаў, замкаў, гістарычных мясцін, геаграфічныя падарожжы: Я. Пілецкі «Мінеральныя воды ў Друскеніках»; А. Банзкевіч «Астранамічная абсерваторыя ў Вільні»; «Бібліятэка ў Ватыкане»; «Пулавы і іх ваколіцы»; М. Дубецкі «Нашы помнікі ў Харкаве».

3) Літаратурна-мастацкія творы: празаічныя творы Т. Ежа, Веліслава, Ю. Блізінскага, вершы Яшкоўскага, Ю. Свянціцкага, К. Падвысоцкага, М. Канапніцкай, Гётэ (у перакладзе Л. Енікэ).

4) Навуковыя, гістарычныя, літаратуразнаўчыя і іншыя артыкулы: «Літаратурныя даследванні»; «Аб карысці археалагічных навук»; Райнах «Гістарычны ўплыў Францыі на Германію»; «Аб'яднанне літаратараў Францыі»; К. Лучыцкі «Чэшская літаратура»; Г. Спенцэр «Грамадскія навукі»; Э. Пэрэр «Род людскі»; Ф. Сулімерскі «Тэлефон»; матэрыялы да юбілею Ю.І. Крашэўскага.

5) Агляды:пісьменніцкі, тэатральны, музычны, выяўленчага мастацтва, палітычны (у кожным нумары).

6) Хронікі: замежная, парыжская, штотыднёвая (у кожным нумары).

7) Карэспандэнцыя з Пецярбурга, Познані, Кракава, Львова, Венецыі.

8) Бібліяграфічныя матэрыялы.

*Захаванасць*: страчаны сс. 23-26, 39-42, 55-58, 95-96, 109-114, 135-138, 175-176, 193-194, 215-218, 223-224, 271-272, 279-282, 289-290, 311-312, 345-346, 375-378, 385-386.

Папера, кардон, скура. Тыпаграфскі друк. 37,8х28,4х2,6(58,0) см.

**ПГКЗ КП12-6979**

**4.** Тыгоднік ілюстраваны. Падшыўка №№ 106-131. Т. 5. Серыя 3. Рэдактар Людвік Енікэ (Ludwik Jenike). Выдавец і друкар Юзаф Унгэр (Józef Unger). Варшава. 1878. 410 с.

*Змест.*

1) Біяграфіі: Філіп Чаевіч (Filip Czajewicz), Лявон Дэмбоўскі (Leon Dembowski), Зыгмунт Дзялоўскі (Zygmunt Działowski), Клаўдыуш Бернард (Klaudyusz Bernard), Леапольд Кроненберг (Leopold Kronenberg), Юзаф Майер (Józef Majer), Папа Пій IX (Pius IX), Лявон Рагальскі (Leon Rogalski), Францішак Максіміліян Сабешчанскі (Franciszek Maksymilian Sobieszczański), Уладзімеж Спасовіч (Włodzimierz Spasowicz), Аляксандр Велапольскі (Aleksander Wiełopolski), Віктар Эмануіл II (Wiktor Emanuel II), Ян Сабескі (Jan Sobieski).

2) Апісанні мясцовасцей, замкаў, касцёлаў, гістарычных мясцін, геаграфічныя падарожжы: З. Глогер «Каложа ў Гародне» (Каложская царква ў Гродна XII ст.); Кафедральны касцёл Св. Яна ў Любліне і Люблінская кафедра; Тэафільполь; Паланга і гара Біруты; Л.Стжэлецкі «Замосце і яго помнікі»; А.Павінскі «З суседніх з Польшчай земляў»; «Ля вытокаў Віслы: абразкі з падарожжа» і інш.

3) Літаратурна-мастацкія творы: гістарычны раман Ю.І.Крашэўскага «Скрыпт Флемінга»; драматычныя творы В.Рапацкага; вершы Э. Кшымускага, А. Машэўскага, Ю. Адамчэўскага, М. Канапніцкай, Ю. Вайцяхоўскага, С. Дамброўскага, В. Шыманоўскага, К. Падвысоцкага і інш.

4) Навуковыя, гістарычныя, літаратуразнаўчыя і іншыя артыкулы: «Журналістыка і друк у Злучаных Штатах: гістарычны нарыс»; артыкул П. Хмялоўскага пра аб'яднанні і таварыствы XIX ст. у Польшчы, Літве, Беларусі; В. Марэнэ «Расчараванне ў літаратуры» ; Г.Блюмнэр «Сакрэты мастацкай і рукадзельнай тэхнікі старажытных народаў»; Ц. Вінцэнці «Арабскія студэнты і рэлігійны рух у ісламе»; «У краіне фараонаў»; А. Валынскі «Стасункі Галілея з Польшчай»; Т. Кожан «Гісторыя ў адносінах да свайго народа і ў адносінах да

чалавецтва»; «Становішча жанчын у грамадскім жыцці Парыжа ў XVIII ст.»; П. Стопфер «Маральны і палітычны характар Шэкспіра»; Э. Рэнан «Значэнне філалогіі для гістарычных навук»; У.Наскоўскі «Тэлефон і фанограф»; П. Берт «Уплыў святла на жывыя істоты»; «Забабоны і народныя традыцыі ў Кітаі»; П.Хмялоўскі «Дзейнасць Акадэміі мастацтваў у Кракаве»; «Выстава ў Парыжы».

5) Агляды: пісьменніцкі, мастацкі, агляд навуковых часопісаў паводле П. Хмялоўскага, музычны і тэатральны паводле У. Наскоўскага, палітычны агляд.

6) Хронікі: замежная паводле Ю.І. Крашэўскага, парыжская, штотыднёвая (у кожным нумары).

7) Карэспандэнцыя з Львова, Галіцыі, Пецярбурга, Познані.

*Захаванасць*: страчаны сс. 183-184, 255-256, 311-314, 363-364.

Папера, кардон, скура. Тыпаграфскі друк. 38,0х28,3х2,4(58,7) см.

**ПГКЗ КП12-6969**

5. Тыгоднік ілюстраваны. Падшыўка №№ 132-157. Т. 6. Серыя 3. Рэдактар Людвік Енікэ (Ludwik Jenike). Выдавец і друкар Юзаф Унгэр (Józef Unger). Варшава. 1878. 378 с.

*Змест.*

1) Біяграфіі: Герман Фудакоўскі (Herman Fudakowski), Эдвард Клопман (Edward Klopman), Баляслаў Ладноўскі (Bolesław Ladnowski), Раман Пастэмскі (Roman Postemski), Юзаф Растафінскі (Józef Rostafiński), Жан Жак Русо (Jan Jakub Rousseau), Уладзіслаў Тарноўскі (Władysław Tarnowski), Казіміж Буйніцкі (Kaźmirz Bujnicki), Вальтэр (Voltaire).

2) Апісанні мясцовасцей, замкаў, касцёлаў, гістарычных мясцін, геаграфічныя падарожжы: «Рымскія катакомбы і навейшыя ў іх адкрыцці»; Б. Грабоўскі «Чэшская Прага»; «Парэчча» (Пінскі павет); А. Вэйнэрт «Сандомеж і значныя пабудовы ў ім»; Ф. Сурын «Лісты з падарожжа па краі» (апісваецца Крэва, Гальшаны).

3) Літаратурна-мастацкія творы: раман Ю.І. Крашэўскага «Скрыпт Флемінга» (працяг); аповесць Яна Захарыасевіча «Tajemnica Stefanii»; вершы К. Падвысоцкага, М. Канапніцкай, А. Канечнай, Ф. Казубоўскага і інш.

4) Літаратуразнаўчыя, навуковыя, гістарычныя, мастацтвазнаўчыя і іншыя артыкулы: П. Хмялоўскі «Дзейнасць Акадэміі мастацтваў у Кракаве» (працяг); В. Невядомскі «З хронікі вынаходніцтваў»; «Забабоны і народныя традыцыі ў Кітаі» (заканчэнне); П. Стопфер «Маральны і палітычны характар Шэкспіра»; П. Берт «Уплыў святла на жывыя істоты»; М. Дубавецкі «Чарнецкі ў Даніі»; «Магамет: характарыстыка прарока»; В. Гумберт «Жанчыны ў лірычнай паэзіі Гётэ»; Райнах «Аб інтэлектуальным уплыве Германіі на Францыю»; Г. Леман «Памор’е з часоў Отта ІІІ Вялікага»; «Жанчыны Вялікай французскай рэвалюцыі.»; «Грэчаская цывілізацыя ў сваім дзейсным развіцці»; «Маральныя нормы і жыццё ў Старажытным Егіпце»; А. Павінскі «Польская ксілаграфія»; В. Каратынскі «Дасягненні польскага друку»; «Урэгуляванне вод Палесся»; «Музей імя Каперніка ў Рыме»; «З жыцця Ю.І. Крашэўскага»; «Невядомы ліст Міцкевіча»; артыкулы, прысвечаныя розным выставам у Парыжы, у Крулікове і ў іншых гарадах; артыкулы Л. Енікэ, Ю.І. Крашэўскага, Т. Ежа, К. Кашэўскага, С. Жэнткоўскага, прысвечаныя тысячнаму нумару часопіса «Тыгоднік ілюстраваны».

5) Агляды: палітычны, пісьменніцкі, тэатральны (паводле У. Наскоўскага), прагляд навуковых часопісаў паводле П.Хмялоўскага.

6) Хронікі: замежная паводле Ю.І. Крашэўскага, штотыднёвая.

7) Карэспандэнцыя з Галіцыі, Лібавы, Познані, Плоцка, Пецярбурга.

8) Характарыстыка новых выданняў, кніг, альбомаў.

*Захаванасць*: страчаны сс.111-114, 129-130, 135-138, 207-208, 211-212, 223-226, 231-232, 257-258, 289-290, 303-304, 315-316, 321-324, 329-330, 397-406.

Папера, кардон, скура, тканіна. Тыпаграфскі друк. 38,3х28,5х2,7(59,6) см.

**ПГКЗ КП12-6978**

**6.** Тыгоднік ілюстраваны. Падшыўка №№ 210-235. Т. 9. Серыя 3. Рэдактар Людвік Енікэ (Ludwik Jenike).Выдавец і друкар Юзаф Унгэр (Józef Unger). Варшава. 1880. 350 с.

*Змест.*

1) Біяграфіі: Ян Длугаш (Jan Długosz), Ян Дзялынскі (Jan Działyński), Аляксандр Дзедушыцкі (Aleksander Dzieduszycki), Томас Альва Эдысан (Tomasz Alva Edison), Аляксандр Крэмэр (Aleksander Kremer), Юліуш Косак (Juliusz Kossak), Тэадор Мараўскі (Teodor Morawski), Казімiж Астроўскі (Kaźmirz Ostrowski), Людвік Паўлоўскі (Ludwik Powłowski), Артур Паплаўскі (Artur Popławski), Карал Пшыбароўскі (Karol Przyborowski), Войцэх Савінскі (Wojciech Sowiński), Адам Сузін (Adam Suzin), Генрык Вяняўскі (Henryk Wieniawski), Браніслаў Залескі (Bronisław Zaleski), Севярын Здзітавецкі (Seweryn Zdzitowiecki), Міхал Зелянеўскі (Michał Zieleniewski), Ян Зялінскі (Jan Ziełiński), Адам Жултоўскі (Adam Żółtowski).

2) Апісанні мясцовасцей, касцёлаў, замкаў, гістарычных мясцін, геаграфічныя падарожжы: У. Сяркоўскі «Парафіяльны касцёл у Таржках»; С. Пшыбароўскі «Радам і яго ваколіцы»; «Будынак Школы мастацтваў у Кракаве»; А. Целіхоўскі «Дом Длугаша ў Сандомежы»; «Помнік Тадэвушу Касцюшку ў любельскім Янове»; Ю. Фінкельхаўз «Лісты з Афрыкі».

3) Літаратурна-мастацкія творы: драматычны твор С.Грудзінскага «Метэоры»; раман Ю.І. Крашэўскага «Хворыя душы»; творы А. Глембоцкага, Р. Старкеля, Ю. Шуйскага; вершы Богуша, М. Канапніцкай, Чэслава, Феліцыяна.

4) Навуковыя, гістарычныя, літаратуразнаўчыя артыкулы: «Катаванне князя Мікалая ІІ у 1493 г.»; «Напалеон І і яго акружэнне ў эпоху консульства»; А. Павінскі «Некалькі новых звестак пра Марціна Бельскага»; «З жыцця Лінкальна»; П.Стапфер « Гётэ і Лесінг»; Ф. Лагоўскі «Ян Каханоўскі ў лекцыях прафесара Тарноўскага»; В. Невядомскі «З хронікі навейшых вынаходніцтваў»; «Грамадства з часоў Гамера»; Ф. Лагоўскі «Адносіны сям'і і школы»; Ф. Лагоўскі «Сродкі, якія пабуджаюць моладзь да навукі»; В. Марэнэ «Некалькі слоў аб дзіцячай літаратуры»; С. Жэнткоўскі «Што такое начытанасць?» (пра стан выдавецкай справы ў Польшчы»; А. Павінскі «Шэдэўры грэчаскага мастацтва».

5) Агляды: пісьменніцкі, тэатральны (паводле Э. Л юбоўскага, С. Жэнткоўскага), музычны (паводле У. Гурскага), мастацкі, палітычны.

6) Хронікі:замежная паводле Ю.І. Крашэўскага.

7) Карэспандэнцыя з Вены, Познані, Галіцыі, Плоцка, Кракава, Парыжа.

*Захаванасць*: страчаны сс.13-16, 55-58, 69-76,81-82, 95-96, 105-106, 127-128, 135-138, 141-142, 167-170, 199-202, 215-218, 247-250, 253-254, 263-266, 273-274, 295-298, 327-330, 343-346, 359-360, 395-396.

Папера, кардон, скура. Тыпаграфскі друк. 38,0x29,2x3,2(57,0) см.

**ПГКЗ КП12-6970**

**7.** Тыгоднік ілюстраваны. Падшыўка №№ 236-261. Т. 10. Серыя 3. Рэдактар Людвік Енікэ (Ludwik Jenike). Выдавец і друкар Юзаф Унгэр (Józef Unger). Варшава. 1880. 398 с.

*Змест.*

1) Біяграфіі: М. Байзэр (M. Bajzer), Сафія Шуазёль-Гуф'е з роду Тызенгаўзаў (Zofia Choiseul-Gouffier z Tyzenhauzów), Юліян Дунаеўскі (Julian Dunajewski), Казіміж Глінка-Янчэўскі (Kaźmirz Glinka-Janczewski), Марцэліна Каханьска (Marcelina Kochańska), Ксаверы Францішак Маліноўскі (Ksawery Franciszek Malinowski), Генрык Невянглоўскі (Henryk Niewęgłowski), Адам Пражмоўскі (Adam Prażmowski), Іпаліт Скімбаровіч (Hipolit Skimborowicz), Тытус Швідэрскі (Tytus Świderski), Аляксандр Тышыньскі (Aleksander Tyszyński), Эдвард Вольф (Edward Wolff).

2) Апісанні мясцовасцей, касцёлаў, замкаў, гістарычных мясцін, геаграфічныя падарожжы: «Краснаполь»; П. Быкоўскі «Вінніца старадаўняя і сучасная»; «Ратуша ў Бруселі»; «Акадэмія мастацтваў у Вене»; А. Пшыбылоўскі «Каменка над Днястром»; А. Павінскі «Падарожныя лісты з Партугаліі».

3) Літаратурна-мастацкія творы: празаічныя творы Т. Ежа, Ф. Казубоўскага, драматычны твор В. Шыманоўскага «Пасаг», вершы Богуша, Л. Немаеўскага, М. Канапніцкай.

4) Навуковыя, літаратуразнаўчыя, гістарычныя і іншыя артыкулы: Ф. Сурын «Эразм Атвіноўскі…»; «Грамадства з часоў Гамера»; С. Смолка «Ян Длугаш»; А. Валынскі «Князі Ябланоўскія ў літаратуры»; В. Невядомскі «З галіны навейшых адкрыццяў і вынаходніцтваў»; «З бягучай хвіліны навуковага

руху»; «Аб праве ўласнасці ў Спарце»; Ю. Фалькоўскі «Вобразы з нядаўняга мінулага»; А. Павінскі «Лісты з археалагічнага кангрэсу ў Партугаліі»; Б. Грабоўскі «Ян Сабескі ў старахарвацкай паэзіі»; «Акадэмія Міцкевіча ў Балоны»; Л. Енікэ «Сяхновічы – мяркуемае месца нараджэння Т. Касцюшкі»; Л. Енікэ «Сяхновічы або Мерачоўшчына?»; «Невядомы ліст Касцюшкі»; «Ліст Л. Любамірскай да Касцюшкі»; адозва пані Марыі (праўнучкі Касцюшкі) на публікацыі ў часопісе матэрыялаў пра Т. Касцюшку; артыкулы на педагагічную тэматыку.

5) Агляды: пісьменніцкі, тэатральны (паводле Э. Любоўскага і В. Шыманоўскага), музычны (паводле У. Гурскага), мастацкі, палітычны.

6) Хронікі: штотыднёвая, замежная паводле Ю.І. Крашэўскага.

7) Карэспандэнцыя з Парыжа, Галіцыі, Познані, Наленчова.

8) Выдавецкія навіны.

*Захаванасць*: страчаны сс. 25-26, 151-152, 175-176, 287-288, 305-306, 311-314, 367-368, 375-378, 399-400.

Папера, кардон, скура, тканіна. Тыпаграфскі друк. 38,0х28,5х2,8(58,8) см.

**ПГКЗ КП12-6984**

**8.** Тыгоднік ілюстраваны. Падшыўка №№ 262-287. Т. 11. Серыя 3. Рэдактар Людвік Енікэ (Ludwik Jenike). Выдавец і друкар Юзаф Унгэр (Józef Unger). Варшава. 1881. 402 с.

*Змест.*

1) Біяграфіі: Вільгельм Гордлічка (Wilhelm Hordliczka), Станіслаў Янікоўскі (Stanisław Janikowski), Карал Клос (Karol Kloss), Оскар Кольберг (Oskar Kolberg), Каятан Красоўскі (Kajetan Krassowski), Карнель Кшэчуновіч (Kornel Krzeczunowicz), Ігнацы Машчэнскі (Ignacy Moszczeński), Зыгмунт Наскоўскі (Zygmunt Noskowski), Анджэй Рыдзоўскі (Andrzej Rydzowski), Раман Сангушка (Roman Sanguszko), Людвік Скжыньскі (Ludwik Skrzyński), Адам Слатвіньскі (Adam Słotwiński), Роза Сабаньска (Róża Sobańska),Тэадор Трыплін (Teodor Tripplin), Юзаф Вэрнэр (Józef Werner),

Фларэнціна Влашкова (Florentyna Włoszkowa), Мікалай Зыблікевіч (Mikołaj Zyblikiewicz).

2) Апісанні мясцовасцей, касцёлаў, замкаў, гістарычных мясцін, геаграфічныя падарожжы: «Бернардзінскі касцёл і кляштар ў Заславе Валынскім»; «Лядовы грот у Добжыне»; «Касцёл у Замброве»; «Разваліны замка ў Ліве»; «Новы будынак сейма ў Львове»; А. Банзкевіч «Крыніца»; А. Павінскі «Падарожныя лісты з Партугаліі».

3) Літаратурна-мастацкія творы: гістарычны раман Ю.І. Крашэўскага «Кажушок з аўчыны»; апавяданні Веліслава, юмарыстычнае апавяданне Э. Любоўскага, драматычны твор В.Шыманоўскага «Статуя» (працяг), вершы А. Канечнай, М. Канапніцкай, Ю. Корвіна, Чэслава, Дантэ (у перакладзе Феліцыяна).

4) Навуковыя, гістарычныя, літаратуразнаўчыя, мастацтвазнаўчыя і іншыя артыкулы: В. Невядомскі «З бягучай хвіліны навуковага руху»; А. Бэлцікоўскі «Эльжбета Дружбацкая з Кавальскіх» (літаратуразнаўчае даследванне); Ф. Сурын «Сучасныя раманісты Польшчы і іх творчасць»; «Адкрытае пісьмо аб стане польскага правапісу»; В. Чаеўскі «Байкі Мікалая Рэя з Нагловіц»; П. Хмялоўскі «Забытыя паэмы Вацлава Патоцкага»; Э. Рэнан «Марк Аўрэлій»; Ф. Сурын «Францішак Дыяніс Княжнін»; Э. Рэнан «Фларэнцыя як калыска Адраджэння»; Т. Еж «Палеміка па праблемах літаратуры»; Л. Енікэ «Зноў аб месцы нараджэння Т.Касцюшкі»; «Помнік Міцкевічу ў Кракаве»; В. Невядомскі «Будаўніцтва Панамскага канала»; «Акадэмія Міцкевіча ў Балоны»; Я. Фінкельхауз «Нямецкая антысеміцкая ліга»; В. Невядомскі «Праект пракладу чыгункі праз Сахару»; «Невядомы ліст Т. Касцюшкі»; Ф. Лагоўскі «Пачатковае навучанне».

5) Агляды: пісьменніцкі, тэатральны (паводле Э. Любоўскага), музычны (паводле У. Гурскага), мастацкі, палітычны.

6) Хронікі: замежная паводле Ю.І. Крашэўскага, парыжская, штотыднёвая.

7) Карэспандэнцыя з Познані, Галіцыі, Прагі.

*Захаванасць*: страчаны сс. 15-16, 119-122, 127-128, 193-194, 223-224, 305-306, 343-344, 353-354.

Папера, кардон, скура, тканіна. 38,2х28,4х3,0 (57,9) см.

**ПГКЗ КП12-6983**

**9.** Тыгоднік ілюстраваны. Падшыўка №№ 315-339. Т. 13. Серыя 3. Рэдактар Людвік Енікэ (Ludwik Jenike). Выдавец №№ 315-337 Юзаф Унгэр (Józef Unger), выдавец №№ 338-339 Грацыян Унгэр (Gracyan Unger). Друк Юзафа Унгэра (Józefa Ungra). Варшава. 1882. 400 с.

*Змест.*

1) Біяграфіі: Чарльз Дарвін (Karol Darwin), Ігнацы Чарвякоўскі (Ignacy Czerwiakowski), Аўгусцін Дэболі (Augustyn Deboli), Валенты Дуткевіч (Walenty Dutkiewicz), Джузэпе Гарыбальдзі (Józef Garibaldi), Юзаф Гулкоўскі (Józef Gółkowski), Юліан Грабоўскі (Julian Grabowski), Вільгельм Гондзіус (Wilhelm Hondius), Генрык Ібсен (Henryk Ibsen), Юзаф Юрчыч (Józef Jurczicz), Паўліна Кракавова (Paulina Krakowowa), Альфрэд Млоцкі (Alfred Młocki), Тамаш Адам Астроўскі (Tomasz Adam Ostrowski), Юзаф Пшыбароўскі (Józef Przyborowski), Эдвард Рулікоўскі (Edward Rulikowski).

2) Апісанні мясцовасцей, касцёлаў, замкаў, гістарычных мясцін, геаграфічныя падарожжы: «Замак ў Нясвіжы»; «Касцёл Св. Аляксандра ў Дамброве»; А. Зентаскі «Капліца на гары Біруты ў Прыбалтыцы»; У. Бернацкі «Сімвалы і знакі на старадаўніх будынках Варшавы»; «Ратуша ў Краславе»; «Руіны балецкага замка»; Ю. Хадаровіч «Непаломіцэ»; «Парафіяльны касцёл у Здыньскай Волі»; «Касцёл у Грайфенбергу».

3) Літаратурна-мастацкія творы: раман «На бездарожжы» (аўтар нявысветлены); «Лісты Ёрдана да пана Яна»; празаічныя творы П. Быкоўскага, Веліслава, вершы М. Канапніцкай, Л. Немаеўскага, Ю. Вяржбіцкага, С. Урбаноўскай, Ю. Залескага, Ю. Корвіна, Е. Ласкарыса і інш.

4) Навуковыя, гістарычныя, літаратуразнаўчыя і іншыя артыкулы: С. Тамкевіч «Дадатак да біяграфіі Уладзіслава Сыракомлі»; Л. Енікэ «З 1683 года»; В. Невядомскі «З хронікі навейшых дасягненняў і навуковых адкрыццяў»; А. Валынскі «Музей Каперніка ў Рыме і Акадэмія Міцкевіча ў Балоны»; «Польскі музей у Торуні»; Я. Смолер «Аб маральна-рэлігійным характары лужыцкіх сербаў».

5) Агляды: пісьменніцкі, мастацкі (жывапісу і скульптуры), тэатральны, музычны, палітычны.

6) Хронікі: замежная, штотыднёвая (у кожным нумары).

7) Карэспандэнцыя з Львова, Познані, Парыжа, Кракава, Прагі.

8) Выдавецкія навіны Польшчы.

*Захаванасць*: страчаны сс. 317-318.

Папера, кардон, скура, тканіна. Тыпаграфскі друк. 38,7x28,3x2,5(57,7)см.

**ПГКЗ КП12-6974**

**10.** Тыгоднік ілюстраваны.Падшыўка №№ 315-366. Т. 13. Серыя 3. Т. 14. Серыя 3.* Рэдактар Людвік Енікэ (Ludwik Jenike). Выдавец №№ 315-337 Юзаф Унгэр (Józef Unger), выдавец №№ 338-366 Грацыян Унгэр (Gracyan Unger). Друк Юзафа Унгэра (Józef Unger). Варшава. 1882. 658 с.

*Змест.*

1) Біяграфіі, змешчаныя ў Т. 13: Чарльз Дарвін (Karol Darwin), Ігнацы Чарвякоўскі (Ignacy Czerwiakowski), Валенты Дуткевіч (Walenty Dutkiewicz), Джузэпе Гарыбальдзі (Józef Garibaldi), Юзаф Гулкоўскі (Józef Gółkowski), Юліан Грабоўскі (Julian Grabowski), Вільгельм Гондзіус (Wilhelm Hondius), Юзаф Юрчыч (Józef Jurczycz), Паўліна Кракавова (Paulina Krakowowa), Альфрэд Млоцкі (Alfred Młocki), Тамаш Адам Астроўскі (Tomasz Adam Ostrowski), Юзаф Пшыбароўскі (Józef Przyborowski), Рычард Ропель (Ryszard Röpell) ,Эдвард Рулікоўскі (Edward Rulikowski), Фларыян Стаблеўскі (Floryan Stablewski), Антоні Юзаф Шабранскі (Antoni Józef Szabrański), Вінцэнты Трыбульскі (Wincenty Trybulski), Ваўжынец Жмурка (Wawrzyniec Żmurko). Біяграфіі, змешчаныя ў Т. 14: Людвік Бланц (Ludwik Blanc), Зыгмунт Гаргалеўскі (Zygmunt Gorgolewski), Вацлаў Ганка (Wacław Hanka), Станіслаў Ябланоўскі (Stanisław Jabłonowski), Мустафа Кара (Mustafa Kara), Ганна Краеўска з Лявіцкіх (Anna z Lewickich Krajewska), Эльжбета Краснагорска (Elżbieta Krasnohorska), Станіслаў Лукас (Stanisław Lukas), Аляксандр Астроўскі (Aleksander Ostrowski), Крыстын Астроўскі (Krystyn Ostrowski), Леапольд Марцін Отта (Leopold Marcin Otto), Генрык Панофка (Henryk

* У падшыўцы змешчаны 2 тамы (Т. 13, Т .14). Нумарацыя старонак у кожным томе асобная.

Panofka), Пётр Прэрадовіч (Piotr Preradowicz), Ірма Райхова (Irma Reichowa), Ізаяш Тэгнэр (Izajasz Tegner), Марцін Замойскі (Marcin Zamojski), Ян Канстанты Жупаньскі (Jan Konstanty Żupański).

2) Апісанні мясцовасцей, касцёлаў, замкаў, гістарычных мясцін, геаграфічныя падарожжы: «Замак у Нясвіжы»; «Касцёл Св. Аляксандра ў Дамброве»; «Руіны балецкага замка»; У.Бернацкі «Сімвалы і знакі на старадаўніх будынках Варшавы»; А. Зентаскі «Капліца на гары Біруты ў Прыбалтыцы»; Ю.Хадаровіч «Непаломіцэ»; «Парафіяльны касцёл ў Здыньскай Волі»; «Касцёл у Грайфенбергу»; «Двор у Ленках Гурных»; «Купель у Кжыжановіцах»; «Водалячэбніца ў Крыніцы»; «Атвоцкі замак і парк»; «Парафіяльны касцёл у Карнове»; помнік Ф. Страшэўскаму ў Кракаве; «Фарны касцёл Св. Кацярыны ў Гужы»; А. Ябланоўскі «Абразкі з Усходу»; У. Запалоўскі «Вандроўка па Свентакжызкай (świętokrzyzkiej) зямлі»; «З падарожных нататкаў па Польшчы»; У. Гурскі «Пірамíды ў Гізе»; «Вуліцы Каіра»; «Даўняя паштовая дарога праз гару Св. Готарда ў Германіі».

3) Літаратурна-мастацкія творы: раман «На бездарожжы» (аўтар нявысветлены); «Лісты Ёрдана (Jordana) да пана Яна; празаічныя творы В. Марэнэ, Веліслава, П. Быкоўскага, вершы К. Канапацкай, Л. Немаеўскага, М. Канапніцкай, А. Адынца, Ю. Залескага, Ю. Корвіна, Чэслава і іншых.

4) Літаратуразнаўчыя, навуковыя, гістарычныя і іншыя артыкулы: Л. Енікэ «З 1683 года»; С. Тамкевіч «Дадатак да біяграфіі Уладзіслава Сыракомлі»; літаратуразнаўчы артыкул Б. Хлябоўскага пра польскую літаратуру XVII ст.; «Навейшы твор Яна Матэйкі»; В. Невядомскі «З хронікі навейшых дасягненняў і навуковых адкрыццяў»; Я. Кубары «Астравы ў «Вялікім акіяне»(этнаграфічнае даследванне); Я. Смолер «Аб маральна-рэлігійным характары лужыцкіх сербаў»; А. Валынскі «Музей Каперніка ў Рыме»; «Акадэмія Міцкевіча ў Балоны»; «Польскі музей у Торуні»; С. Жэнткоўскі «Музей пчалярства ў Варшаве»; Э. Мюнтц «Італьянскае мецэнатства у XVI ст.: мастацтва і літаратура ў Рыме з часоў праўлення Сыкстуса IV»; Б. Завадскі «Міжнародная выстава мастацтваў у Рыме»; В. Невядомскі «Шляхі нябесных цел»; В. Невядомскі «З бягучай хвіліны навуковага руху»; М. Кянпеньскі «Пешховец

і Вінагура» (гістарычны артыкул); Э. Лубоўскі «Гістарычныя даследванні»; матэрыялы, прысвечаныя Яну Сабескаму, аб’яднаныя ў рубрыку «Себасціяна»; Ю. Лоскі «Станіслаў Ян Ябланоўскі»; артыкулы, аб’яднаныя ў рубрыку «Гігіена і педагогіка»; «З маскоўскай выставы»; «Юбілейныя выданні Яна Каханоўскага»; «Сара Бернар і Гелена Маджаеўска».

5) Агляды: пісьменніцкі, выяўленчага мастацтва і скульптуры, тэатральны (паводле Э. Любоўскага і Б. Завадскага), музычны (паводле У. Гурскага), палітычны.

6) Хронікі:замежная паводле Ю.І. Крашэўскага, штотыднёвая.

7) Карэспандэнцыя з Львова, Познані, Парыжа, Кракава, Прагі, Плоцка.

8) Выдавецкія навіны.

*Захаванасць*: страчаны ў Т. 13 сс. 11-16, 19-22, 27-30, 41-50, 59-60, 99-110, 119-120, 135-142, 145-146, 151-154, 159-160, 167-170, 183-184, 197-204, 215-218, 223-224, 229-236, 251-252, 279-282, 311-314, 317-318, 359-362, 367-368, 375-382, 385-394, 399-400. Страчаны ў Т. 14 сс. 23-26, 33-34, 119-122, 171-172, 199-202, 247-245, 269-272, 279-282, 285-288, 301-304, 317-320, 323-334, 343-346, 395-396, 407-408.

Папера, кардон, скура. Тыпаграфскі друк. 38,2х30,0х4,2(59,0) см.

**ПГКЗ КП12-6982**

**11.** Тыгоднік ілюстраваны. Падшыўка №№ 340-366. Т.14. Серыя 3. Рэдактар Людвік Енікэ (Ludwik Jenike). Выдавец Грацыян Унгэр (Gracyan Unger). Друк Юзафа Унгэра (Józef Unger). Варшава. 1882. 370 с.

*Змест.*

1) Біяграфіі: Пётр Прэрадовіч (Piotr Preradowicz), Станіслаў Ябланоўскі (Stanisław Jabłonowski), Аляксандр Астроўскі (Aleksander Ostrowski), Ян Канстанты Жупаньскі (Jan Konstanty Żupański), Марцін Замойскі (Marcin Zamojski), Крыстын Астроўскі (Krystyn Ostrowski), Станіслаў Лукас (Stanisław Lukas), Зыгмунт Гаргалеўскі (Zygmunt Gorgolewski), Генрык Панофка (Henryk Panofka), Эльжбета Краснагорска (Elżbieta Krasnohorska), Ганна Краеўска (Anna Krajewska

z Lewickich), Ізаяш Тэгнэр (Izajasz Tegner), Людвік Бланц (Ludwik Blanc).

